

ДЗЕНЬ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА Ў ІВАЦЭВІЧАХ 8-9

КАБ ШКОЛА БЫЛА Ў РАДАСЦЬ 11



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

31 ЖНІЎНЯ 2024 г. СУБОТА № 170 (30304)

# Сёння — вучыцца. Заўтра — адказваць за Айчыну

*Навучэнцам, студэнтам, аспірантам, настаўнікам, навукова-педагагічным работнікам*

Дарагія сябры!

Ад усёй душы віншую вас з Днём ведаў.

Традыцыйна, адкрываючы ў верасні новы навучальны год, мы ўсе разам робім крок у будучыню. Бо сённяшнія школьнікі, студэнты і курсанты, спасцігаючы пад кіраўніцтвам як маладых, так і ўмудроных вопытам педагогаў азы навук і прафесій, рыхтуюцца заўтра ўзяць на сябе адказнасць за нашу Айчыну. Гэта вам прымаць эстафету ў старэйшых пакаленняў: будаваць дамы, сеяць хлеб, ствараць і асвойваць сучасныя тэхналогіі, абараняць Радзіму. А яшчэ захоўваць гістарычную памяць, культуру і традыцыі — аснову асноў жыцця народа. Вучыцеся старанна. Перакананы, вы зможаце зрабіць нашу краіну яшчэ больш моцнай і прыгожай.

Самыя вялікія хваляванні на ўрачыстых лінейках, вядома, перажываюць першакласнікі і іх бацькі. Няхай школа стане для вас праваднiком у неабдымны свет ведаў, сапраўдным храмам навукі, а таксама надзейным і ўтульным домам, напоўненым радасцю новых здзяйсненняў, пазітыўнымі эмоцыямі і ўсмешкамі адданых сяброў.

Жадаю ўсім, каб навучальны год быў паспяховым для айчыннай сістэмы адукацыі, падарыў мноства падстаў для гордасці за дасягненні нашых дзяцей і моладзі.

Мірнага неба, здароўя, цярпення і ўдачы.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**




Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

**Вучні 2 «А» класа сярэдняй школы № 152 імя С. С. Бельчанкі горада Мінска Цімафей Мемус, Ульяна Грачова, Юлія Кондэ, Аляксандра Парцянкова, Іван Пракапенка са сваім класным кіраўніком Галінай Нікіцінай.**

## Падмурак маральнасці і грамадзянскасці

*Удзельнікам і гасцям Дня беларускага пісьменства*

Паважаныя сябры!

Шчыра вітаю гасцей і ўдзельнікаў Дня беларускага пісьменства, які сёлета адзначаецца на гасціннай брэсцкай зямлі, у самабытным горадзе Івацэвічы.

Гэтае свята нагадвае нам аб важнасці захавання і развіцця праз кнігу нацыянальнай культурнай спадчыны, духоўных традыцый народа. Такія каштоўнасці яднаюць людзей і спрыяюць росквіту краіны. Літаратура і матчына мова былі і застаюцца падмуркам у выхаванні высокіх маральных якасцяў, фарміраванні грамадзянскасці.

Упэўнены, што беларусы заўжды з павагай будуць адносіцца да нашага гістарычнага здабытку, берагчы невычэрпныя культурныя скарбы продкаў, штодзённай працай умацоўваць суверэнітэт дзяржавы. Шанаваць нашу мову і славутых майстроў слова — песняроў роднай зямлі.

Сардэчна жадаю гасцям і ўдзельнікам мерапрыемства здароўя, згоды і дабрабыту, а таксама новых цікавых сустрэч, поспехаў і творчага натхнення.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

### Афіцыйна

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 30 жніўня правёў шэраг міжнародных тэлефонных размоў.**

Кіраўніку дзяржавы пазванілі лідары замежных дзяржаў: Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі Уладзімір Пуцін, Прэзідэнт Таджыкістана Эмамалі Рахмон, Прэзідэнт Азербайджана Ільхам Аліеў, Прэзідэнт Узбекістана Шаўкат Мірзіёеў.

Адбыліся таксама тэлефонныя размовы з намеснікам старшыні Савета бяспекі Расійскай Федэрацыі Дзмітрыем Мядзведзевым і старшынёй Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Валянцінай Матвіенка.

Абмяркоўваліся пытанні развіцця двухбаковых адносін і маючая адбыцца ў пачатку кастрычніка сустрэча на вышэйшым узроўні. Суразмоўнікі таксама павіншавалі Аляксандра Лукашэнку з днём нараджэння.

ISSN 1990 — 763X

З нагоды

# ПАДАРУНАК ДА ДНЯ ВЕДАЎ

## У Мінскім раёне адкрылі першы арэндны дом для педагогаў

**У вёсцы Лескаўка, што пад Бараўлянамі, старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН узяў удзел у адкрыцці новага арэнднага дома для педагогаў і іх сем'яў. Адметна, што гэта першы падобны дом у краіне. Узвесці арэнднае жыллё для настаўнікаў прапанаваў Мінскі аблвыканкам. Кіраўнік дзяржавы падтрымаў гэтую ідэю. Сваё жыллёвае пытанне вырашаць як вопытныя педагогі прысталічнага рэгіёна, так і маладыя спецыялісты. Яны атрымаюць ключы ад новых кватэр. Дарэчы, пра гэты аб'ект беларускі лідар гаварыў падчас нядаўняга педсавета. Сказана — зроблена! Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што аналагічнае будаўніцтва плануецца і ў Брэсцкай вобласці. Карэспандэнт «Звязды» адправіўся ў Мінскі раён, каб далучыцца да мерапрыемства, якое стала для многіх сапраўдным святам.**

### Куток шчасця

Новы дом — не проста будынак. Гэта сімвал новага этапу жыцця, развіцця і росквіту Мінскага раёна. Важная падзея для дзясяткаў яго жыхароў. Тут, у новых сучасных кватэрах будуць нараджацца і ўвасабляцца мары і планы, панаваць гарманічная атмасфера добрасуседства. Кожны з жыхароў абавязкова знойдзе свой куток шчасця.

СТАР. 3

Фота Данііла ХМЯЛЬНІЦКАГА.



Сацыяльны клопат

# Вопыт, варты пераймання

## Адбылося пасяджэнне кансультатыўнага савета пры Савеце Рэспублікі па пытаннях сацыяльнай адаптацыі і інтэграцыі дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця

**Падтрымка сацыяльна неабароненых катэгорый насельніцтва, у тым ліку людзей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, з'яўляецца неад'емнай часткай дзяржаўнай палітыкі. Значную ўвагу пытанням лячэння, сацыяльнай адаптацыі і інтэграцыі дзяцей з інваліднасцю і асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ўдзяляе Савет Рэспублікі. З моманту стварэння кансультатыўнага савета (верасень 2022 года) адбылося ўжо пяць пасяджэнняў на розныя тэмы, падчас якіх узнімаліся, а ў выніку былі вырашаны праблемныя моманты. Тэма чарговага кансультатыўнага савета — сістэма прафесійнай падрыхтоўкі маладых людзей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця і ўмовы для іх сацыялізацыі на прыкладзе горада Мінска.**

Сталіцы ў гэтым плане ёсць чым пахваліцца: нягледзячы на свае няпростыя дыягназы, маладыя людзі маюць магчымасць атрымліваць прафесію, а потым працаваць. Вядучыя прадпрыемствы краіны прымаюць у свае шэрагі высокакваліфікаваных спецыялістаў, якія запатрабаваны ў рэальным сектары эканомікі.

### АБМЕН ВОПЫТАМ І ЗАМАЦАВАНАСЦЬ КАДРАЎ

У гэтым плане варты пераймання вопыт падрыхтоўкі і адаптацыі дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, далейшай іх інтэграцыі ў грамадства Мінскага дзяржаўнага каледжа лічбавых тэхналогій. Менавіта на пляцоўцы навучальнай установы і адбыўся кансультатыўны савет, на які невыпадкова былі запрошаны намеснікі старшыняў аблвыканкамаў і начальнікі абласных упраўленняў адукацыі. Па словах **Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі КАЧАНАВАЙ**, рэгіёны павінны бачыць, што трэба і можна рабіць для такіх дзяцей, каб укараняць падобны вопыт на месцах.

«Мы гэта пытанне даўно трымаем на кантролі: не толькі ў горадзе Мінску, а ў цэлым у нашай краіне, — падкрэсліла спікер у размове з журналістамі. — Дзяржавай створаны ўсе ўмовы для таго, каб такія хлопцы і дзяўчаты былі адаптаваны ў грамадства, атрымлівалі прафесію, заканчвалі навучальныя ўстановы. Для гэтага ў нас ёсць пашыраная сетка навучальных устаноў, цэнтры карэкцыйнага развіцця. У тэрытарыяльных цэнтрах ёсць гурткі, дзе хлопцы і дзяўчаты займаюцца. Нам было важна ісці далей — для таго, каб яны атрымлівалі спецыяльнасць і маглі працаваць, рэалізаваць сябе, бо гэта таленавітыя дзеці».

Кажучы аб Мінскім дзяржаўным каледжы лічбавых тэхналогій, Наталля Качанава адзначыла, што тут створаны цудоўныя ўмовы для навучэнцаў. «Ёсць розная ступень страты здароўя, розныя дыягназы ў такіх дзяцей, — канкрэтызавала яна. — Хтосьці татальна невідушчы, хтосьці з асаблівасцямі слыху і практычна не чуе. Сёння тут навучаюцца ўжо і дзеці з аўтыстычным расстройствам. Калі мы пабывалі ў гэтым каледжы некалькі гадоў таму, я ўбачыла вельмі зацікаўленага кіраўніка ўстановы, які сапраўды хоча зрабіць нешта вельмі важнае і патрэбнае».

Як расказаў **дырэктар Мінскага дзяржаўнага каледжа лічбавых тэхналогій Георгій КОЗЕЛ**, за 60 гадоў існавання навучальнай установы педагогі падрыхтавалі і выпусцілі 786 хлопцаў і дзяўчат. «Наш каледж рыхтуе праграмістаў, спецыялістаў па мікраэлектроніцы і нанатэхналогіях, робататэхніцы, мехатроніцы, аўтаматызаваных сістэмах кіравання, мабільных лічбавых сістэмах, сакратароў-рэферэнтаў, — канкрэтызаваў ён. — Усе нашы выпускнікі працаладкоўваюцца. Мы суправаджаем іх яшчэ на працягу двух гадоў. Напрыклад, на такім прадпрыемстве, як «Інтэграл», стапрацэнтная замацаванасць кадраў. «Інтэграл» — флагман краіны, лепш за яго ў дадзеным кірунку ніхто не працуе: гэта адзінае прадпрыемства электроннага профілю, якое робіць афіцыйныя заяўкі на падрыхтоўку спецыялістаў з ліку асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця».

### ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ПАДЫХОД І ПАДТРЫМКА

Адно з пытанняў, на якое ўпаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы ў горадзе Мінску звярнула ўвагу ўдзельнікаў кансультатыўнага савета, — стварэнне дадатковых месцаў для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ў сярэдніх спецыяльных установах. Не менш важнае пытанне, узнятае спікерам, — куды выпускнікоў такіх устаноў потым адпраўляць для далейшай работы. Хоць прыклады эфектыўнага ўзаемадзеяння навучальных устаноў і прадпрыемстваў ёсць. Напрыклад, усе выпускнікі Мінскага дзяржаўнага каледжа лічбавых тэхналогій гэтага года забяспечаны першым працоўным месцам: маладыя людзі ўжо прыступілі да работы на вядучым прадпрыемстве мікраэлектроннай галіны краіны — на ААТ «Інтэграл». Запатрабаваныя выпускнікі навучальнай установы і ў Парку высокіх тэхналогій. «Ёсць унікальныя хлопцы і дзяўчаты, якія выдаюць унікальныя рашэнні, непадуладныя многім іншым дзецям, якія вучацца ў звычайных гімназіях і школах нашай краіны», — канкрэтызавала Старшыня Савета Рэспублікі.

Наталля Качанава прапанавала стварыць Асацыяцыю сярэдніх спецыяльных устаноў, дзе вучацца дзеці з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. «Для таго каб педагогі маглі збірацца, праводзіць семінары, дзяліліся вопытам, наведвалі свае ўстановы і бачылі, што яшчэ трэба рабіць у далейшым для таго, каб гэтым хлопцам і дзяўчатам было камфортна вучыцца і, самае галоўнае, каб яны былі запатрабаваны на рынку працы, — растлумачыла спікер. — Для такіх навучэнцаў гэта вельмі важна. Дзіця атрымае спецыяльнасць і будзе адчуваць сябе нармальным, патрэбным сваёй краіне чалавекам. Яны патрэбны нам і сёння, з самага нараджэння. У нас няма раздзялення: мы ўсе — людзі нашай краіны».

Пры гэтым Старшыня Савета Рэспублікі заўважыла, што працаваць з дзецьмі, якія маюць асаблівасці псіхафізічнага развіцця, трэба індывідуальна, да кожнага, па меркаванні спікера, трэба знайсці падыход.

«Мы ўсё можам вырашаць, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Я заўсёды цытую Прэзідэнта нашай краіны: "Усе рашэнні, якія прымаюцца, павінны быць на карысць дзяржавы". Калі гэта нам трэба — мы павінны гэта зрабіць. Таму ўсё павінна быць накіравана менавіта на гэтую задачу».

Удзельнікі кансультатыўнага савета азнаёміліся з арганізацыяй навучальнага працэсу ў Мінскім дзяржаўным каледжы лічбавых тэхналогій. Наведалі лабараторыю кадзіравання лічбавай інфармацыі, смарт-лабараторыю, азнаёміліся з дзейнасцю цэнтра духоўна-маральнага і інклюзіўнага выхавання. Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін перадаў цэнтру камплект кніг духоўнай тэматыкі. Наталля Качанава ўручыла навучэнцам каледжа камплекты адзення, а таксама сертыфікат на вучэбнае абсталяванне. «Вы таленавітыя, вы разумныя, вы патрэбныя нашай краіне», — падкрэсліла спікер, уручаючы падарункі.

**Начальнік Цэнтра дашкольнай пачатковай інклюзіўнай адукацыі Мінскага гарадскога інстытута развіцця адукацыі Людміла САКАЛОВА** азнаёміла з выстаўкай, на якой прадстаўлены вопыт работы сталіцы па сацыялізацыі навучэнцаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Установы адукацыі, якія працуюць з такімі дзецьмі, прадэманстравалі, як яны дапамагаюць хлопцам і дзяўчатам сацыялізавацца ў грамадстве. Адны вучаць іх плаваць, іншыя — вышываць, аздабляць кераміку, ствараць упакоўку для цукерак і іншае.

«Вельмі важна даць дзіцяці пасля школы рамяство для таго, каб яно было паспяховым у будучыні і магло забяспечваць самога сябе, — лічыць Людміла Сакалова. — І для дзяцей гэта важна — хлопцы і дзяўчаты адчуваюць сябе патрэбнымі. Яны цудоўныя, творчыя, ім проста крыху трэба дапамагчы, каб яны знайшлі сябе ў нашым грамадстве. Яны вельмі чакаюць нашай падтрымкі».

**Вераніка КАНЮТА.**

Парламенцкі дзённік

# Перыяд небывалага ўзроўню ўзаемаадносін

## Старшыня Палаты прадстаўнікоў сустрэўся з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь

**Сустрэча Ігара СЕРГЯЕНКІ і Се СЯАЮНА адбылася з нагоды завяршэння дыпламатычнай місіі пасла ў нашай краіне. Падчас размовы былі падведзены пэўныя вынікі сумеснай работы і акрэслены планы на будучыню.**

На пачатку размовы Старшыня Палаты прадстаўнікоў адзначыў, што за гады работы ў нашай краіне пасол па-сапраўднаму глыбока ўнік ва ўсе актуальныя аспекты беларуска-кітайскіх адносін, ва ўсе сумесныя праекты і зрабіў важкі ўнёсак у іх рэалізацыю і ажыццяўленне.

«Амаль чатыры гады — гэта немалы час. Я думаю, знаходжанне ў Беларусі пакінула ў вас яркія ўражанні на ўсё жыццё...

...За гэты, здавалася б, па мерках жыцця чалавека, невялікі перыяд вы нямала зрабілі, і нямала яркіх падзей прыпадае на вашу кадэнцыю ў Рэспубліцы Беларусь. Знакавай падзеяй у развіцці нашых адносін, канешне, стала прыняцце ў верасні 2022 года на палях саміту ШАС у Самаркандзе Сумеснай Дэкларацыі аб устанаўленні найвышэйшага ў гісторыі адносін іх узроўню: усепагоднага ўсебаковага стратэгічнага партнёрства. Вы таксама ўнеслі ўклад у тое, каб гэта адбылося.

Менавіта дзякуючы нашым кіраўнікам — Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь Аляксандру Рыгоравічу Лукашэнку і Старшыні Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпіну — наладжаны рэгулярны сістэмны абмен дэлегацыямі на найвышэйшым узроўні, праводзіцца канкрэтная работа, і ўдалося дасягнуць такіх вынікаў. Мы ўдзячны кітайскаму боку і асабіста вам за падтрымку ў арганізацыі афіцыйнага візіту прэм'ера Дзяржсавета КНР Лі Цяна, які адбыўся літаральна ў гэтым месяцы. Вынікам стала падпісанне вялікага пакета пагадненняў і дамоўленасцяў у эканамічнай сферы. Вядома ж, ключавое — гэта няўрадавае пагадненне аб гандлі паслугамі і ажыццяўленні інвестыцый, якое прадугледжвае стварэнне зоны свабоднага гандлю паміж нашымі краінамі. Гэта далейшы крок на шляху нашага найперш эканамічнага супрацоўніцтва», — адзначыў Ігар Сергяенка.

Ён таксама засяродзіў увагу на тым, што актыўна развіваецца міжпарламенцкі дыялог, а шматгранная ўзаемадзеянне па парламенцкай лініі і ў далейшым будзе ўмацоўвацца на ўзроўні Камітэта высокага ўзроўню па супрацоўніцтве паміж заканадаўчымі органамі Беларусі і Кітая.

«Краіны традыцыйна ўзаемадзейнічаюць у рамках міжнародных арганізацый, у іх аднолькавае стаўленне да ўсялякага знешняга ціску, які падрывае стабільнасць і ўстойлівасць развіцця, мы заўсёды прытрымліваліся прынцыпаў аднаго Кітая, і такая лінія будзе, вядома ж, нязменнай. У далейшым разлічваем таксама на падтрымку Кітая на міжнародных пляцоўках нашай пазіцыі. Удзячныя за вашу падтрымку ў прыняцці Беларусі ў ШАС у якасці паўнапраўнага члена, а таксама ў прасоўванні беларускай заяўкі на атрыманне статусу дзяржавы — партнёра БРІКС», — зазначыў Старшыня Палаты прадстаўнікоў.

У сваю чаргу Се Сяаюн адзначыў, што час яго работы ў Беларусі супаў з асаблівым перыядам у адносінах паміж дзвюма краінамі — яны выйшлі на небывалы ўзровень і захоўваюць тэндэнцыю дынамічнага развіцця. Абодва бакі цвёрда падтрымліваюць адзін аднаго па пытаннях, якія датычацца ключавых інтарэсаў.

За апошні час гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва паміж краінамі значна актывізавалася: мінулагодні таваразварот у 28 разоў большы за тавараабарот 2020 года.

«Супрацоўніцтва паміж заканадаўчымі органамі — важны складнік у нашых адносінах. Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь падтрымлівае цесныя кантакты з Усекітайскім сходам народных прадстаўнікоў і робіць актыўны ўклад ва ўстойлівае і доўгатэрміновае развіццё кітайска-беларускіх адносін. У мінулым годзе група дружбы паміж Усекітайскім сходам народных прадстаўнікоў і Нацыянальным сходам Рэспублікі Беларусь была пераўтворана ў Камітэт высокага ўзроўню па супрацоўніцтве паміж заканадаўчымі органамі Кітая і Беларусі», — нагадаў Се Сяаюн.

Ён запэўніў, што кітайскі бок гатовы прыкладаць намаганні для ўмацавання дружалюбнага абмену паміж заканадаўчымі органамі дзвюх краін на ўсіх узроўнях. Гэта, паводле слоў дыпламата, надасць дадатковы імпульс рэалізацыі дамоўленасці кіраўнікоў нашых дзвюх дзяржаў і ўзбагачэнню зместу двухбаковых адносін.

**Уладзімір ВЯРЭНІЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Польшча плануе павялічыць ваенныя выдаткі амаль да пяці працэнтаў ВУП

Лідары партый, якія ўваходзяць у кааліцыйны ўрад Польшчы, прынялі рашэнне закласці ў праект новага дзяржаўнага бюджэту выдаткі на абарону ў памеры 4,7 працэнта ад нацыянальнага ВУП, што складзе 190 мільярдаў злотых (каля $49,3 млрд). Пра гэта паведаміла ТАСС са спасылкай на радыёстанцыю RMF FM. Калі бюджэт з такім паказчыкам будзе зацверджаны, Польшча стане лідарам сярод дзяржаў НАТА па абаронных выдатках. Паводле звестак RMF FM, нястачу, якая ўзнікне ў выніку росту абаронных расходаў, палітыкі кааліцыі плануюць ліквідаваць у тым ліку за кошт адмены дзяржаўных даплат да расходаў насельніцтва за электраэнергію. Сёлета ў бюджэце Польшчы ўжо запланаваны рэкордныя выдаткі на абарону на ўзроўні 4,1 працэнта ВУП. Як заяўляў у пачатку жніўня польскі прэзідэнт Анджэй Дуда, у грашовым вылічэнні яны складуць амаль 40 мільярдаў долараў. Цяпер толькі пяць краін НАТА накіроўваюць на абарону больш за тры працэнты ВУП. Гэта Польшча, Эстонія, ЗША, Латвія і Грэцыя.

### У ЗША пашыраецца попыт на будаўніцтва прыватных бункераў

Іх узводзяць на выпадак беспарадкаў, нападаў тэрарыстаў і ядзернай катастрофы. Пра гэта паведаміла Fox News са спасылкай на дырэктара кампаніі-вытворцы бункераў Atlas Survival Shelters Рона Хабарда. «Цяпер бізнес квітнее. Мы робім бункеры коштам ад $20 тысяч долараў да $1 млн. Некаторыя з нашых бункераў каштуюць нават больш за мільён», — сказаў Хабард. Ён таксама заявіў, што сёння кампанія ў сярэднім прадае як мінімум адзін бункер у дзень, а яго тэлефон разрываецца ад званкоў заказчыкаў. У матэрыяле адзначаецца, што апошнім часам многія амерыканцы занепакоены сацыяльнай напружанасцю ў грамадстве. Згодна з вынікамі апытання Marist National Poll, праведзенага ў маі, 13 працэнтаў жыхароў ЗША лічаць, што грамадзянская вайна вельмі верагодная, а яшчэ 34 працэнты кажуць, што яна верагодная.

# ПАДАРУНАК ДА ДНЯ ВЕДАЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Дадзеная падзея — вынік намаганняў улады і творчай энергіі інжынераў, будаўнікоў і ўсіх тых, хто ўклаў сваю любоў да прафесіі і душу ў гэта збудаванне.

Перад тым як разрэзаць чырвоную стужку, кіраўнік вобласці звярнуўся да навасёлаў: «Я хацеў бы павіншаваць вас з набыццём жылля і надыходзячым святам — Днём ведаў! Я вельмі паважаю прафесію педагога. Яна спалучае шмат добрых якасцяў: уменне працаваць з дзецьмі і, вядома, цярпенне ў рабоце з бацькамі».



Жыхары падзякавалі старшыні Мінаблвыканкама за яго пільную ўвагу і дапамогу ў вырашэнні пытанняў жыхароў прысталічча: «Ад імя ўсіх навасёлаў хачу падзякаваць вам за тую ўвагу, якую вы аказваеце нам, настаўнікам, — звярнулася да губернатара **настаўніца Бараўлянскай гімназіі Паліна ЛІХТАРОВІЧ.** — Разуменне, дапамога, падтрымка ў вырашэнні жыллёвага пытання вельмі важныя для кожнага чалавека, бо ўтульны сямейны ачаг — гэта надзейнасць, стабільнасць, магчымасць жыць і планаваць будучыню. Выбраўшы прафесію, ад усёй душы любячы яе, мы запэўніваем вас у тым, што прыкладзём усе намаганні для выхавання годнай будучыні нашай любімай Беларусі».



## Такая практыка будзе працягвацца

Дарэчы, практыка будаўніцтва арэнднага жылля для работнікаў сацыяльнай сферы Міншчыны будзе працягвацца. «Для Мінскага раёна жыллёвая тэма вельмі актуальная. За апошнія гады мы пабудавалі тут шмат аб'ектаў для сістэмы адукацыі. Гэта школы і дзіцячыя садкі. Я думаю, што ў наступным месяцы ўвядзём у строй яшчэ адзін дзіцячы садок у Бараўлянах, а пасля — і новую школу. Усе яны патрабуюць вялікай колькасці педагагічных работнікаў. Блізкасць сталіцы аказвае свой уплыў. Размаўляючы з уладальнікамі новага жылля, чарговы раз пераконваемся, што маем рацыю. Асабліва для такіх рэгіёнаў, як Мінскі, жыллё з'яўляецца калі не вызначальным, то вельмі важным фактарам для замацавання спецыялістаў, прычым не толькі маладых», — адзначыў старшыня Мінаблвыканкама.

Ён дадаў, што наяўнасць уласнага жылля асабліва важная для падтрымкі маладых спецыялістаў, якія прыязджаюць па размеркаванні ў Мінскі раён: «Для маладога педагога новая школа ды яшчэ і са сваім жыллём — проста нейкія фантастычныя рэчы. Але насамрэч яны вельмі правільныя. І гэта якраз тое, што мы абмяркоўвалі на педагагічным савеце з удзелам кіраўніка дзяржавы».

Лясны, Лескаўка, Вопытны, Бараўляны стварылі сваю агламерацыю, і ў найбліжэйшы час тут таксама з'явіцца шмат сацыяльна значных аб'ектаў. «Будуецца школа, якую здадуць у эксплуатацыю ў наступным годзе, сёлета ўвядзём Цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва ў Бараўлянах. У Лескаўцы ўзводзіцца ФАК, каб усе жыхары маглі займацца спортам, — заявіў кіраўнік вобласці. — З пункту гледжання камфорту, гэтыя населеныя пункты становяцца вельмі добрым месцам для людзей».

Па меркаванні Аляксандра Турчына, выдзяленне арэнднага жылля для работнікаў сацыяльнай сферы па той жа схеме, што і для ваеннаслужачых, было б найбольш зручным: «Адпрацоўваеш, напрыклад, 15 гадоў, і пасля гэтага маеш права набыць жыллё на пэўных умовах ва ўласнасць. Гэта было б добрай магчымасцю для бюджэтнікаў вырашыць свае жыллёвыя праблемы. Таму, вядома, мы такую практыку, асабліва ў Мінскім раёне, будзем працягваць. Сёння абмяркоўвалі лакацыю ў Лескаўскі Бараўлянскага сельсавета, паўднёвы напрамак Мінскага раёна — Сеніца, Прылукі, дзе будуецца шмат аб'ектаў сацыяльнай сферы».

Кіраўнік Міншчыны запрасіў журналістаў 21 верасня наведаць абласныя «Дажынкі», што пройдуць у Валожыне: «Там вы ўбачыце шмат цікавага. Мы рэалізавалі праект па будаўніцтве дома на 12 кватэр. І якраз для невялікіх раёнаў гэта таксама вельмі ўдалае вырашэнне праблемы жылля для работнікаў сацыяльнай сферы. Думаю, з наступнага года ў невялікіх раённых цэнтрах пачнём інтэнсіўна будаваць такія дамы для прыцягнення і замацавання спецыялістаў».

Старшыня Мінаблвыканкама падкрэсліў, што гэты дом быў пабудаваны па асобным распараджэнні Прэзідэнта. «Улічваючы, што кіраўнік дзяржавы гаварыў пра гэта на педагагічным савеце, думаю, такія праекты будуць інтэнсіўна маштабавацца не толькі ў Мінскай вобласці, але і ва ўсіх рэгіёнах нашай краіны», — падсумаваў Аляксандр Турчын.

## Першы госць у новым доме

Атрымаць ключы ад арэнднай кватэры было сапраўдным падарункам для сям'і **музычнага кіраўніка дзіцячага садка вёскі Лескаўка Алены НІКАЛАЕВАЙ.** Шчаслівыя гаспадары запрасілі старшыню Мінаблвыканкама да сябе ў кватэру. Да гэтага сям'я жыла ў інтэрнаце. У мужа і жонкі трое дзяцей, двое з іх — школьнікі, і цяпер іх шлях да школы займае ўсяго адну хвіліну: адразу за домам — бараўлянская школа № 3.

Кіраўніка вобласці ў першую чаргу цікавіла, як педагог ставіцца да таго, каб у будучыні арэнднае жыллё можна было выкупляць у прыватную ўласнасць з растэрміноўкай плацяжу праз, напрыклад, 10 гадоў работы ў сістэме адукацыі. «Выдатна, таму што, калі шчыра, гэта вельмі хвалюе ўсіх», — сказала шматдзетная мама. «Мы будзем разглядаць такі варыянт, паколькі для нас важна вырашаць задачу па прыцягненні кадраў у школы, дзіцячыя сады», — адказаў Аляксандр Турчын.

Алена Нікалаева працуе ў адукацыйнай сферы з 2014 года: «Пачынала ў Кіраўску, затым пераехалі ў Бабруйск. Цяпер лёс занёс мяне ў Бараўляны. Да гэтага працавала ў школе, цяпер — у дзіцячым садку. У сям'і ў нас трое дзяцей. Два сыночкі і лапачка-дочка. Старэйшаму сыну — 12, сярэдняму — 10, а дачцэ — 3 гады».

Па словах жанчыны, жыллёвае пытанне стаяла востра: спачатку шматдзетная сям'я здымала кватэру, пасля ім выдзелілі інтэрнат: «І я нават не разлічвала, што змагу атрымаць сапраўдную кватэру! Лічу, што ўласнае жыллё — велізарная перспектыва для маладых спецыялістаў. І, вядома, гэта вельмі прыемна мне як шматдзетнай маме. Ды і моладзі нашай таксама прыемна, бо новае жыллё — як сапраўдны стымул застацца тут пасля адпрацоўкі».

Кватэры гатовыя да пражывання, навасёлам трэба будзе толькі завезці мэблю. Ужо гатовыя санвузлы, на кухні стаіць пліта. Дарэчы, ацяпляцца кватэры будуць індывідуальнымі газавымі катламі. На тэрыторыі двара і ў пад'ездах створана безбар'ернае асяроддзе, абсталявана стаянка для веласіпедаў. За захаванасць маёмасці жыхары могуць не перажываць: на дамах устаноўлена відэаназіранне.

## «Падтрымаць і вынесці на заканадаўчым узроўні»

Чырвоную стужку Аляксандр Турчын перарэзаў разам з **настаўніцай з бараўлянскай гімназіі Палінай Ліхтаровіч і са старшынёй Мінскага райвыканкама Уладзімірам ЮРГЕВІЧАМ.** Мінскі раён актыўна развіваецца. Штогод ён прырастае ад пяці да васьмі тысячамі чалавек. Гэта звязана найперш з міграцыяй, урбанізацыяй насельніцтва. Людзі знаходзяць сябе ў сталіцы, у Мінскім раёне. Для іх заўсёды тут знойдуцца працоўныя месцы.

«Патрэба ў сацыяльных аб'ектах у Мінскім раёне апошнія пяць гадоў задавальнялася і задавальняецца ў перспектыве. За пяцігодку мы пабудавалі 13 дзіцячых дашкольных устаноў і чатыры школьныя. Вядома, спатрэбілася прыкласці немалыя намаганні, каб забяспечыць гэтыя ўстановы кадрамі. Адсюль і з'явілася ідэя зрабіць жыллё і замацаваць у першую чаргу педагогаў, — адзначыў Уладзімір Юргевіч. — Вялікі дзякуй кіраўніку дзяржавы, які асобным распараджэннем дазволіў нам рэалізаваць гэты праект. Таму ў перспектыве для работнікаў сацыяльнай сферы такую ідэю трэба падтрымаць і вынесці на заканадаўчым узроўні, каб спецыялісты маглі набыць гэта жыллё ва ўласнасць праз пэўны час. Гэта можна вызначыць нарматыўным актам».

У вёсцы Лескаўка будуецца два арэндныя дамы для медыкаў на 140 кватэр, а таксама адзін дом для цэнтральнай раённай клінічнай бальніцы ў Бараўлянах: «Штогод у сацыяльную сферу прыходзіць каля 1,5 тысячы маладых спецыялістаў. Праблему з замацаваннем кадраў трэба вырашаць. І мы шляхі вырашэння бачым. Дзесьці стараемся самі, а дзесьці — з падтрымкай кіраўніка дзяржавы», — адзначыў Уладзімір Юргевіч.

Ключы ад новага жылога дома на 40 кватэр у вёсцы Лескаўка атрымалі работнікі 13 устаноў адукацыі. Вельмі радасна, што ў нашай краіне з'яўляюцца такія сацыяльна значныя аб'екты, пашыраюцца магчымасці для падтрымкі педагогаў.

**Даніїл ХМЯЛЬНІЦКІ,**
**фота аўтара.**



Добрая навіна

# Зарплата бюджэтнікаў вырасце з верасня

**Заработная плата бюджэтнікаў за верасень павялічыцца, бо з 1 верасня бягучага года павышаецца базавая стаўка.**

Як паведамілі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны, у адпаведнасці з рашэннем урада з 1 верасня памер базавай стаўкі складзе 253 рублі. Сёлета гэта ўжо другое яе павышэнне, якое закране больш як 800 тысяч работнікаў бюджэтнай сферы. Нагадаем, першы раз у 2024-м базавая стаўка была павялічана з 1 студзеня на 6,4 %, з 235 да 250 рублёў.

У параўнанні з мінулым годам сёлета памер базавай стаўкі павялічыцца на 9 працэнтаў. Адзначым, што яна з'яўляецца асноўным элементам тарыфнай сістэмы, на аснове якой ажыццяўляецца аплата працы работнікаў бюджэтнай сферы. Паколькі да базавай стаўкі прывязаны іншыя стымуляцыйныя і кампенсацыйныя выплаты, то іх памеры таксама вырастуць.



Акрамя гэтага, у мэтах павелічэння памеру заработнай платы ў работнікаў бюджэтных арганізацыяй прымаюцца меры па ўстанаўленні дадатковых стымуляцыйных выплат асобным катэгорыям. У прыватнасці, работнікам адукацыі — з 1 студзеня і 1 верасня; фізічнай культуры і спорту — з 1 сакавіка; аховы здароўя — з 1 мая; сацыяльнага абслугоўвання — з 1 ліпеня; культуры — з 1 жніўня.

— У выніку прынятых мер сярэднямесячная заработная плата работнікаў бюджэтных арганізацый за шэсць месяцаў бягучага года павялічылася ў параўнанні з адпаведным перыядам мінулага на 18,3 % і склала 1696,1 рубля, рэальная заработная плата ўзрасла з тэмпам 111,9 %, — адзначылі ў міністэрстве.

У цэлым на аплату працы работнікаў бюджэтнай сферы сёлета плануецца накіраваць каля 17,6 мільярда рублёў, у тым ліку на дадатковыя стымуляцыйныя выплаты асобным катэгорыям работнікаў — каля 1,64 мільярда рублёў.

**Алена КРАВЕЦ.**

Соцыум

# АДПАЧЫНАК ДЛЯ АМАЛЬ 400 ТЫСЯЧ ШКОЛЬНІКАЎ

**Летняя аздараўленчая кампанія прайшла ў штатным рэжыме. Пры гэтым попыт на пуцёўкі ў лагеры сёлета быў надзвычай высокі. Большасць з іх працавалі ў пяць, а некаторыя — і ў шэсць змен. Літаральна ўчора са сваімі выхаванцамі развіталіся ў двух лагерах, якія завяршылі свае змены пазней за ўсіх. Пра вынікі дзіцячага аздараўлення расказалі спецыялісты.**




Фота БелТА.

— Попыт сёлета быў як ніколі вялікі. Мы гэтага чакалі. Давер да летняй аздараўленчай кампаніі, да арганізацый, якія прымаюць на аздараўленне і адпачынак дзяцей, з боку бацькоў быў сапраўды вельмі высокі, — адзначыў **намеснік дырэктара — начальнік аддзела дзяржаўных закупак і метадычнай работы Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва Аляксандр ЦАЙ.**

На правядзенне дзіцячай летняй аздараўленчай кампаніі дзяржавай заўсёды выдзяляюцца значныя аб'ёмы фінансавых сродкаў. Сёлета са сродкаў рэспубліканскага бюджэту было выдаткавана больш як 64 мільёны рублёў, у мінулым годзе — 61,5 мільёна.

З гэтых сродкаў 61,9 мільёна рублёў пайшлі на патанненне кошту пуцёвак для дзяцей у аздараўленчыя, спартыўна-аздараўленчыя лагеры, 1,7 млн — на набыццё бясплатных пуцёвак для дзяцей, якія пражываюць або навучаюцца на забруджаных радыенуклідамі тэрыторыях, і іншых ільготных катэгорый. Каля 600 тысяч рублёў — на аказанне дапамогі ў падрыхтоўцы лагераў да работы ў летні перыяд.

Асаблівая ўвага — загараднаму аздараўленню дзяцей, дзе дасягаецца найбольшая эфектыўнасць. І ўласнікі, і абласныя, і Мінскі гарадскі выканаўчыя камітэты сур'ёзна падышлі да гэтага пытання і выдзелілі значнае фінансаванне на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы стацыянарных загарадных лагераў. Сёлета на гэтыя мэты былі выдзелены рэкордныя за апошнія гады аб'ём сродкаў — больш як 30 мільёнаў рублёў. Сюды ўвайшлі грошы ўласнікаў, мясцовых і рэспубліканскага бюджэтаў, прафсаюзаў, спонсарская дапамога. Сума выдзеленых сродкаў перасягнула мінулагоднюю на 3 млн рублёў.

— Сапраўды, база загараднага аздараўлення была вельмі добра падрыхтавана. Натуральна, сталіся акцэнты праводзіць максімальную колькасць змен у стацыянарных лагерах. Сёлета мы прагназавалі, што каля 125 тысяч дзяцей пройдуць аздараўленне ў такіх умовах, але атрымалася аздаравіць нават больш. Звыш 126 тысяч школьнікаў прайшлі аздараўленне ў стацыянарных круглагодовых загарадных лагерах, гэта на 7 тысяч больш, чым летась, — адзначыў Аляксандр Цай.

Усяго ж звыш 398 тысяч школьнікаў прайшлі аздараўленне і адпачынак у аздараўленчых, спартыўна-аздараўленчых лагерах. Гэта на дзевяць тысяч больш, чым летась, і на пяць тысяч больш, чым планавалася на гэты год. 168,7 тысячы дзяцей прайшлі аздараўленне ў круглагодовых лагерах і 229,5 тысячы — з дзённым знаходжаннем.

Павышаная ўвага сёлета — аздараўленню дзяцей-сірот і дзяцей-інвалідаў. У лагерах пабывалі 11 600 дзяцей-сірот і 5700 дзяцей з інваліднасцю — на 11 % больш, чым летась. Яны адпачывалі ў аздараўленчых лагерах, дзе маюцца ўмовы даступнага асяроддзя і магчымасць медыцынскага суправаджэння.

Для дзяцей, хворых на цукровы дыябет, была арганізавана змена ў санаторыі «Сонейка» ў Слуцкім раёне. Больш за 130 малых адпачывалі разам з бацькамі. Амаль цалкам аздараўленне было аплачана са сродкаў рэспубліканскага бюджэту і Мінгарвыканкама. Шэрагу іншых катэгорый дзяцей — дзецям-інвалідам, дзецям-сіротам, дзецям са шматдзетных і малазабяспечаных сем'яў — гэтак жа дапамаглі адпачыць абласныя выканкамы і Мінгарвыканкам, якія ажыццяўлялі даплату да кошту пуцёвак. Акрамя таго, даплаты ажыццяўлялі наймальнікі па калектыўных дагаворах, прафсаюзы, шэраг іншых арганізацый.

Што датычыцца баўлення часу ў лагерах, то вялікая ўвага сёлета ўдзялялася правядзенню тэматычных змен, прысвечаных традыцыйным каштоўнасцям беларусаў, павазе да гістарычнага мінулага і дасягненняў краіны на сучасным этапе, папулярызацыі дзяржаўных сімвалаў Беларусі. Ва ўсіх лагерах адбыліся мерапрыемствы, прымеркаваныя да Дня Незалежнасці. У Нацыянальным дзіцячым адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Зубраня» прайшоў маштабны форум — рэспубліканскі злёт дзіцячага актыву «Школа юнага грамадзяніна». У гэтай змене прыняло ўдзел больш за тысячу актывістаў школьнага і вучнёўскага самакіравання.

Трэба адзначыць, што працавалі тэматычныя лагеры ў кожным рэгіёне. Яны аб'ядноўвалі школьнікаў, якія займаюцца па IT-профілі, пераможцаў алімпіяд, конкурсаў, фестываляў, КВЗ.

— Па якім бы профілі школьнік ні займаўся, адпаведна яго інтарэсам можна было знайсці тэматычныя атрады, змены, лагеры. Попыт і быў такі вялікі, бо мы прапанавалі шырокі спектр паслуг у арганізацыі вольнага часу, — падзялілася меркаваннем **кансультант галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі Таццяна АСМАЛОЎСКАЯ.**

Трэці аздараўленчы сезон у лагерах праходзіць акцыя «Крок да поспеху». У ёй бяруць удзел прадстаўнікі міністэрстваў прамысловасці, сувязі, інфармацыі, кіраўнікі вядучых прадпрыемстваў, буйных арганізацый, вядомыя акцёры і рэжысёры, спартсмены, журналісты. Напрыклад, у «Зубраняці» сапраўдны фурор у выхаванцаў выклікала сустрэча з касманаўтамі Марынай Васілеўскай і Алегам Навіцкім. Сустрэчы праходзілі ў розных формах: дыялогавай пляцоўкі, «100 пытанняў да дарослага», шчырай размовы. Цікавілі школьнікаў розныя аспекты: як адбыцца ў прафесіі, як сумяшчаць працу і асабісты час? Больш за 60 тысяч дзяцей сталі сёлета ўдзельнікамі праектных мерапрыемстваў акцыі «Крок да поспеху».

Адно з актуальных пытанняў старшых школьнікаў і навучэнцаў — дзе падпрацаваць? І тут трэба адзначыць, што лагеры працы і адпачынку захаваліся ў тым жа аб'ёме, як і ў ранейшыя сезоны. Сёлета выхаванцаў прынялі больш за тысячу такіх устаноў, дзе 15 тысяч падлеткаў змаглі і адпачыць, і зарабіць. Акрамя таго, летам было арганізавана каля 20 тысяч працоўных акцый, дзе паўднічала больш за 200 тысяч выхаванцаў аздараўленчых лагераў, а ўсяго 480 тысяч дзяцей і падлеткаў — кожны другі школьнік.

Не страцілі сваёй актуальнасці і студатрады. Іх было сфарміравана больш за дзве тысячы, а іх удзельнікамі сталі 29 тысяч маладых людзей, у тым ліку 14 тысяч непаўналетніх. Асаблівая ўвага з боку выхавальнікаў і педагогаў — арганізацыі вольнага часу дзяцей сацыяльна ўразлівых катэгорый. Толькі ў студэнцкіх атрадах працавала 476 падлеткаў, з якімі праводзіцца індывідуальная прафілактычная работа, і 288 тых, хто знаходзіцца ў сацыяльна небяспечным становішчы.

Штогод усё большай папулярнасцю карыстаецца адпачынак у ваенна-патрыятычных лагерах. Сёлета працавалі 744 такія аздараўленчыя ўстановы, дзе адпачылі больш за 25 тысяч дзяцей. Яны цесна ўзаемадзейнічаюць з сілавымі структурамі — Міністэрствам абароны, МУС, Дзяржпагранкамітэтам, МНС, ДТСААФ. У кожным лагеры праходзілі ваенна-патрыятычныя гульні — «Зарніца», «Арлёнак». Для азнаямлення падлеткам была прадстаўлена тэхніка, можна было паразмаўляць з хлопцамі, якія нясуць службу ва Узброеных Сілах, пакаштаваць салдацкую кашу.

Падарожжы па Беларусі былі неад'емнай часткай адпачынку ў лагерах усіх тыпаў. Гэтым летам было арганізавана больш за 11 200 экскурсій для 176 тысяч школьнікаў. Асаблівай папулярнасцю карысталіся Брэсцкая крэпасць і ў цэлым гэты рэгіён, а таксама сталіца. Музеі, забаўляльныя цэнтры, мерапрыемствы ў цэнтрах дадатковай адукацыі, прамысловы турызм — мэты экскурсій былі самыя разнастайныя.

Культурны складнік прадугледжваў і сумесныя мерапрыемствы з установамі культуры і кінавідэапракатамі. Дзеці наведалі 12 тысяч кінасеансаў з фільмамі па гісторыі, культуры Беларусі, ваенна-патрыятычнымі стужкамі.

Умовы надвор'я, у прыватнасці ўраган, які прайшоў па краіне ў канцы ліпеня, прымусіў унесці карэктывы ў меры бяспекі ў тым ліку і ў дзіцячых лагерах.

— Хоць такія ўмовы надвор'я не характэрныя для нашага клімату, мы зразумелі, што трэба ўзмацніць меры бяспекі, яшчэ раз праверыць матэрыяльна-тэхнічную базу, правесці прафілактычную работу з кадрамі, нагадаць, як паводзіць сябе падчас стыхіі. У жніўні ладзілі дадатковыя мерапрыемствы па забеспячэнні бяспекі, абследаванні дрэў, спартыўных аб'ектаў, карпусоў і іншых збудаванняў, прайшлі дадатковыя мерапрыемствы па навучанні, — паведаміла Таццяна Асмалоўская.

**Алена КРАВЕЦ.**

Дзень ведаў

# ПЕРШЫ РАЗ — У ЯКАСЦІ ПЕДАГОГА

**Малады спецыяліст расказаў пра выбар прафесіі, студэнцкія гады, асэнсаваную адказнасць**



**Выпускніца Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна Кацярына Фядковіч у панядзелак сустрэне сваіх першых выхаванцаў не ў якасці практыканткі, як бывала раней, а ў якасці сацыяльнага педагога сярэдняй школы № 1 горада Івацэвічы. Да гэтай падзеі Кацярына Аляксееўна грунтоўна рыхтуецца. Крыху хвалюецца, але ж адчувае падтрымку калег-педагогаў і, вядома, сваіх родных.**

Учарашняя студэнтка згадвае, што псіхалогіяй цікавілася са школьных гадоў, у старшых класах дакладна ведала, што менавіта з гэтым кірункам будзе звязана яе далейшая адукацыя. Спачатку разглядала іншыя ўніверсітэты, потым, перад паступленнем, выбрала Брэсцкі імя Пушкіна.

«Адвезлі з мамай дакументы, сталі чакаць, і 7 жніўня, якраз у дзень нараджэння, атрымала паведамленне, што паступіла на бюджэтную форму навучання сацыяльна-педагагічнага факультэта, — успамінае Кацярына. — Чатыры гады праляцелі хутка. І вось — дыплом у руках, традыцыйны здымак на памяць каля помніка Аляксандру Сяргеевічу, і ты — гатовы спецыяліст. Аж не верыцца», — усміхаецца дзяўчына.

Насамрэч, паводле яе слоў, вучоба была надзвычай цікавай. Усе чатыры гады Кацярына хадзіла ў актывістах, удзельнічала ў студэнцкай навуковай дзейнасці, была ў савеце інтэрната, вяла факультэцкую грамадскую работу. «Цяпер ужо разумею, што ўніверсітэт дае вялізныя магчымасці для самарэалізацыі, для развіцця студэнта. І калі ты не лянівы, можаш многае паспець за гады вучобы, многага дасягнуць. Важна, што наш факультэт багаты моцным выкладчыцкім складам. Нашы педагогі заўсёды дапамогуць, накіруюць таго, хто мае намер сур'ёзна працаваць у гады вучобы», — гаворыць выпускніца ўніверсітэта.

— Я асабліва ўдзячная нашай выкладчыцы — кандыдату педагагічных навук дацэнту Ларысе Аляксандраўне Сілюк. Акрамя таго, што яна выкладала нам дысцыпліны неардынарна, цікава, захапляльна, яна ўзор духоўна багатага чалавека. Ларыса Аляксандраўна вельмі шмат дала нам акрамя тэарэтычных ведаў. І цяпер у любой складанай рабочай сітуацыі ў думках буду звярацца з ёй: а як зрабіла б мая педагог, як бы ацаніла вось гэты мой учынак. Яна вучыла нас не адступаць перад цяжкасцямі, а пераадольваць іх, — працягвае дзяўчына. — І гэта дапамагло ўжо на першай практыцы, бо мая першая практыка была ўзрушэннем. Я трапіла ў Брэсцкі сацыяльна-педагагічны цэнтр, дзе ёсць прытулак для дзяцей, якіх забралі з сям'і. Гэтыя дзеці знаходзяцца пад дзяржаўнай абаронай. Яны чакаюць вырашэння свайго лёсу: магчыма, будуць перададзены пад апеку альбо знойдуць новую сям'ю нейкім іншым чынам. Там у кожнага за плячыма — зусім не дзіцячая гісторыя... А яшчэ мы са сваімі кіраўнікамі практыкі наведвалі сем'і, у якіх дзеці прызнаны ў сацыяльна небяспечным становішчы. І гэта новыя ўзрушэнні. З аднаго боку, у 18 гадоў ты проста не ўяўляеш, што ў наш час людзі жывуць вось так. А з другога — прыходзіць разуменне, што ты маеш маральнае права парушаць асабістыя границы чалавека, напрыклад, адкрыць халадзільнік і паглядзець, ці ёсць там хоць якая ежа. Усё гэта было падчас практыкі. І паступова пачала разумець, наколькі гэтая работа складаная, адказная і патрэбная грамадству.

Потым былі практыкі ў звычайных агульнаадукацыйных школах. Там мы вучыліся працаваць з сем'ямі, якія, дарэчы, таксама бываюць праблемныя. Яшчэ на практыцы стала зразумела, наколькі важны эмацыянальны кантакт з вучнямі. Спадзяюся, што буду яго знаходзіць са сваімі выхаванцамі падчас работы.

Кацярына Фядкевіч нарадзілася і вырасла ў вёсцы Горталь, гэта за 45 кіламетраў ад райцэнтра. Ездзіць кожны дзень дадому не выпадае, таму яна зняла кватэру ў горадзе. Гаворыць, што, калі з'явіцца магчымасць атрымаць арэндную кватэру, будзе вельмі рада. А нядаўна даведалася пра адзін прыемны бонус, які Івацэвіцкі райвыканкам прадугледзеў для маладых спецыялістаў. Банк выдае крэдыт былым студэнтам пад зусім малы працэнт на набыццё мэблі, бытавой тэхнікі, іншых патрэбных тавараў. У далейшым цалкам магчыма ім скарыстацца.

А цяпер сацыяльны педагог сярэдняй школы № 1 імя У. Гукарыхтуецца да Дня ведаў, што будзе на наступны дзень пасля Дня беларускага пісьменства, які сёлета прымаюць Івацэвічы. Малады спецыяліст адзначыла гэты факт як вельмі прыемны. Горад літаральна пераўтвараўся на вачах: Івацэвічы папрыгажэлі і памаладзелі, з'явілася шмат новых арт-аб'ектаў, прыгожых добраўпарадкаваных мясцін. І школа, у якую прыйшла Кацярына, таксама ўвайшла ў праграму падрыхтоўкі да свята. Прыемна ж працаваць у абноўленай установе і жыць няхай у маленькім, але ўтульным, прыгожым горадзе.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

**Фота з архіва Кацярыны ФЯДКОВІЧ.**




# «Спецназ медыцыны, які заўсёды на перадавой»

## У Маладзечне выбралі найлепшыя абласныя брыгады хуткай дапамогі

**У Маладзечне прайшлі III адкрытыя Гульні-спаборніцтвы сярод брыгад службы хуткай медыцынскай дапамогі Мінскай вобласці. Мерапрыемства такога фармату ў цэнтральным рэгіёне праводзіцца ўжо трэці раз. Раней гульні-спаборніцтвы прымалі Узда і Заслаўе. Брыгады медыкаў пазмагаліся за званне найлепшай у вобласці, прайшоўшы праз самыя розныя выпрабаванні і выклікі, з якімі яны нярэдка сутыкаюцца ў паўсядзённай дзейнасці.**

### УВЕСЬ ЧАС НА ПЕРАДАВОЙ

«У гэтых спаборніцтвах удзельнічае 28 каманд. З іх пяць урачэбных і 23 фельчарскія, — распавяла **галоўны ўрач дзяржаўнай установы аховы здароўя «Мінскі абласны цэнтр хуткай медыцынскай дапамогі» Аляксандра ВАРЫВОДСКАЯ.** — Таксама запрошана адна медыцынская каманда з Мінска. Пераможца спаборніцтваў з 25 да 27 верасня гэтага года паўдзельнічае ў рэспубліканскім этапе. Там за званне найлепшай з найлепшых паспаборнічаюць брыгады з усіх абласцей і горада Мінска, а таксама запрошаныя госці з Расійскай Федэрацыі. Рэспубліканскія спаборніцтвы будуць праходзіць у Стаўбцоўскім раёне Мінскай вобласці».

Было прадстаўлена пяць лакацый. Плюс — дадатковая лакацыя масавай траўмы, у якой удзельнічаюць адразу некалькі брыгад. Удзельнікі не ведалі аб выпрабаваннях, аб тым, што чакае іх наперадзе. Для іх гэта — звычайны выклік, дзе яны павінны своечасова і правільна аказаць медыцынскую дапамогу выпадковым пацярпелым. Толькі ўсё гэта — пад пільным наглядам суддзяў, якія ацэньваюць работу брыгад паводле медыцынскіх пратаколаў.

Аляксандра Варыводская патлумачыла, чым адрозніваюцца ўрачэбныя брыгады ад фельчарскіх: «Ва ўрачэбнай брыгадзе маецца ўрач — медыцынскі работнік з вышэйшай адукацыяй плюс два фельчары і кіроўца. Фельчарская брыгада складаецца з двух фельчараў і кіроўцы. Розніца, у першую чаргу, у кваліфікацыі, узроўні абслугоўвання, а таксама ў прычыне выкліку хуткай дапамогі. Пры прыёме выкліку дыспетчар вызначае, якую брыгаду накіраваць. Існуе катэгорыя падстаў для выклікаў, пры якіх адразу адпраўляецца менавіта ўрачэбная брыгада. Напрыклад, страта прытомнасці, адсутнасць дыхання і іншыя больш цяжкія выпадкі. Адрозніваюцца брыгады ў тым ліку і абсталяваннем. Ва ўрачэбнай, напрыклад, ёсць апарат ШВЛ, у той час як у фельчарскай брыгады — інгалятар кіслародны».

«Наша служба адрозніваецца ад паліклінічнага, стацыянарнага звяна. Мы — свайго роду спецназ медыцыны, які ўвесь час знаходзіцца на перадавой. У нас больш цікавая і складаная праца. Яна цяжкая і ў эмацыянальна-псіхалагічным плане, але нашы медыкі — малайцы, яны трымаюцца і заўсёды ў экстраннай сітуацыі ўмеюць сабрацца і адкінуць эмоцыі на другі план», — падсумавала Аляксандра Варыводская.



«Брыгады хуткай медыцынскай дапамогі прадэманструюць прафесійныя навыкі, якія ўжываюць у сваёй штодзённай дзейнасці. Вельмі важна ўдзяляць увагу людзям у белых халатах — сапраўдным патрыётам нашай краіны. Кожнаму вядома, што медыцына не дарує памылак. Людзі, якія працуюць на станцыях хуткай медыцынскай дапамогі, нават у самых экстранных і экстрэмальных сітуацыях прымаюць правільнае рашэнне. Яны пастаянна бяруць адказнасць за захаванне жыцця чалавека. Такая праца сапраўды складаная і вельмі адказная. Яна заслугоўвае асаблівай увагі», — сказала **старшыня Мінскай абласной арганізацыі прафсаюза работнікаў аховы здароўя Вольга КАТАВА.**

### У ЧЫМ ПРЫЧЫНА ГАЛАЎНОГА БОЛЮ І ЯК ВЫРАТАВАЦЬ ТАПЕЛЬЦА

Фармат правядзення мерапрыемства прадугледжваў мадэляванне перад камандамі экстранных сітуацый і здарэнняў, з якімі работнікам службы хуткай медыцынскай дапамогі даводзіцца сутыкацца штодня. З дапамогай спецыяльна падрыхтаванай каманды статыстаў для спецыялістаў службы былі разыграны выпадкі, максімальна набліжаныя да рэальных.

Першая нагода для выкліку хуткай дапамогі, якую мы засведчылі, аказалася нявызначанай: пагаршэнне стану пры немагчымасці ўдакладніць прычыну. Паводле легенды, у 40-гадовага мужчыны забалела галава. Брыгада «хуткай» знайшла яго без прытомнасці на лавачцы ў грамадскім месцы. Спецыялісты абследавалі пацярпелага, аказалі медыцынскую дапамогу, выставілі правільны дыягназ і паспяхова шпіталізавалі яго ва ўстанову аховы здароўя.

«Гэта стандартная сітуацыя — мужчыну стала дрэнна. Скардзіўся на галаўны боль і высокі ціск. Пры абследаванні высветлілася, што ў мужчыны адбылося кровазліццё ў галаўны мозг. Пацыенту была аказана медыцынская дапамога паводле пратаколаў. Брыгада «хуткай» вымерала ціск, цукар, зрабіла кардыяграму. Пасля аказання дапамогі мужчыну даставілі ва ўстанову аховы здароўя ў КТ-кабінет», — сказаў адзін з канкурсантаў, са Старадарожскага аддзялення хуткай медыцынскай дапамогі.

На наступнай лакацыі ў цяжарнай жанчыны 30 гадоў здарыліся сутаргі. Брыгады павінны ўкласціся ў дзесяць хвілін, правільна паставіць дыягназ, аказаць медыцынскую дапамогу, якасна правесці першасны агляд. Найлепшае, што можа зрабіць звычайны чалавек, убачыўшы сутаргі на вуліцы, — павярнуць пацярпелага на бок і чакаць прыбыцця хуткай медыцынскай дапамогі. У такім выпадку у пацыента не заваліцца язык і ён банальна не задыхнецца. Як растлумачылі суддзі, ні ў якім разе нельга нічога сунуць чалавеку ў рот, бо ёсць верагоднасць выламаць зубы, пацярпелы нават можа адкусіць вам пальцы — пры сутаргах людзі не кантралююць сілу сціскання сківіц.

«Нагода да выкліку хуткай дапамогі — сутаргавы сіндром неўдакладнены. Як аказалася, гэта цяжарная жанчына ў эпістатусе. Дыягназ — эклампсія, сутаргавы сіндром. Пацярпелай аказалі медыцынскую дапамогу і даставілі ў найбліжэйшую ўстанову аховы здароўя ў рэанімацыйнае аддзяленне. У рэальнай практыцы такія сітуацыі здараюцца нячаста. Як правіла, усе цяжарныя жанчыны назіраюцца ва ўрачоў. Аднак і такія выпадкі ўсё ж бываюць», — расказаў **фельчар выязной брыгады Дзяржынскага аддзялення хуткай медыцынскай дапамогі Дзмітрый ШАХЛЕВІЧ.**

На наступнай лакацыі адпрацавалі адразу некалькі брыгад хуткай дапамогі разам з байцамі АМАП. У політэхнічным каледжы быў змадэляваны захоп злачынца праваахоўнікамі, а ўдзельнікам спаборніцтваў неабходна было аказаць медыцынскую дапамогу і параненаму злачынцу, і некалькім пацярпелым. Паводле сюжэта, злачынец нанёс студэнтам каледжа колата-рэзаныя траўмы розных частак цела, у тым ліку цяжкія, якія пагражаюць жыццю. Першую дапамогу медработнікі аказвалі на месцы.

«Падстава да выкліку хуткай дапамогі — масавае здарэнне, тэрарызм. У гэтым пункце працавала адразу некалькі брыгад. Канкрэтна ў нашага пацыента быў артэрыяльны крывацёк. Пацярпеламу аказвалі медыцынскую дапамогу па спецыяльным алгарытме. Для пачатку неабходна спыніць крывацёк. Затым падтрымліваеш гемастаз, ціск, кіслярод, пульс, шокавы індэкс, вылічваеш колькасць уліванняў абязбольвальнага, паколькі можа здарыцца пабочны траўматычны шок, што можа пацягнуць за сабой раптоўную смерць. Усё правільна зрабіўшы, неабходна карэктна транспартаваць пацярпелага ва ўстанову аховы здароўя», — растлумачыў **фельчар выязной брыгады Барысаўскага аддзялення хуткай медыцынскай дапамогі Артур ВАЛКАВЕЦ.**

На наступным пункце — адразу два пацярпелыя. Па легендзе, гэта тапельцы, якім неабходна тэрмінова аказаць медыцынскую дапамогу. Пасля вымання пацярпелых з вады іх ні ў якім разе нельга чапаць! У брыгад хуткай дапамогі ёсць усё неабходнае абсталяванне для аказання рэанімацыйных дзеянняў. Спецыялісты робяць штучнае дыханне, правяраюць сатурацыю, забяспечваюць падачу кіслароду, наладжваюць інфузійную тэрапію, а таксама непрамы масаж сэрца. Гэта даволі аб'ёмны комплекс мерапрыемстваў. Як адзначылі суддзі, ніякіх газетных старонак не хопіць на тое, каб цалкам яго апісаць. Для простага чалавека тут галоўнае — не нашкодзіць. Адзінае, што ўсё ж такі можна зрабіць, — выняць з ротавай поласці смецце, ціну, пясок.



### БЫЦЬ ГАТОВЫМІ І ЭМАЦЫЯНАЛЬНА, І ФІЗІЧНА

«Падобныя спаборніцтвы павышаюць агульны ўзровень брыгад, паказваюць, наколькі яны гатовыя да аказання медыцынскай дапамогі. Брыгады прыбываюць на месца выкліку і аказваюць медыцынскую дапамогу. Кожны выпадак ацэньваецца па пэўных крытэрыях з выстаўленнем агульнай адзнакі», — распавёў **фельчар выязной брыгады Маладзечанскага аддзялення хуткай медыцынскай дапамогі Дзяніс АЎДАШКЕВІЧ.** На пасадзе малады чалавек працуе ўжо сем гадоў.

«Разам з калегам Дзянісам выступаем у якасці пацярпелых. Кожная брыгада хуткай медыцынскай дапамогі спрацоўвае паразнаму. Хтосьці хутчэй арыентуецца, хтосьці — крыху павольней. Вельмі ўплывае эмацыянальны фактар. Хтосьці па натуры больш узбуджаны, а хтосьці — больш спакойны, думае разумна. Апошняя катэгорыя людзей лягчэй спраўляецца з задачамі пры стрэсавых сітуацыях», — дапоўніла калегу **фельчар выязной брыгады хуткай медыцынскай дапамогі Маладзечанскай станцыі Аляксандра ІВАНОВА.**

Яны падкрэслілі, што на работу ў «хуткую» людзі прыходзяць падрыхтаваныя як эмацыянальна, так і фізічна. «Абсалютна ўсе брыгады паказваюць добры ўзровень падрыхтоўкі. Ды і медыцынскія каледжы выпускаюць выдатных спецыялістаў», — заключылі фельчары.

Дарэчы, на спаборніцтвах праверылі і вадзіцельскія навыкі. Уменне хутка і правільна пераадольваць створаныя перашкоды паказалі вадзіцелі брыгад хуткай дапамогі. Начальнік аддзела ДАІ Маладзечанскага РАУС Ілья Кулеш нагадаў правілы бяспечнага руху спецтранспарту і што павінны рабіць іншыя ўдзельнікі дарожнага руху, пачуўшы гук сірэны хуткай дапамогі.

Усе ўдзельнікі спаборніцтваў атрымалі сертыфікаты, а таксама памятныя прызы ад Мінскай абласной арганізацыі Беларускага Чырвонага Крыжа. Каманды, якія занялі прызавыя месцы, узнагароджаны дыпламамі і медалямі. Па выніках спаборніцтваў Бараўлянскае аддзяленне станцыі хуткай медыцынскай дапамогі Мінскага раёна стала найлепшым сярод фельчарскіх брыгад. З урачэбных брыгад найлепшай аказалася Барысаўская. Гэтыя дзве брыгады зусім хутка прадставяць Міншчыну на рэспубліканскіх спаборніцтвах.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

*г. Маладзечна.*

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор аукциона)
извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего
**ОАО «Поставский льнозавод».**

Аукцион состоится **17.09.2024 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

**Лот № 1:**

линия длинного льноволокна «Vanhauwaert»

(перечень имущества, входящий в состав Лота № 1, содержится на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by)).

Местонахождение Лота № 1: Витебская обл., г. Поставы, ул. Заводская, 1.
Обременение: залог.
Начальная цена с НДС 20 % – 518 709,46 руб.
Задаток – 82 993,51 руб. Шаг аукциона – 3 %.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, определения лица, выигравшего аукцион, а также условия аукциона содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by).

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений и задатка – 13.09.2024 в 11.00.

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор аукциона)
извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего
**ООО «Полоцкжилстрой»** (Продавец).

Аукцион состоится **16.09.2024 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

**Лот № 1:**
производственный корпус
с инв № 250/U-33008, 5382,0 кв. м.

Незавершённое законсервированное капитальное строение.
Назначение – здание специализированное для производства текстильных, швейных и кожаных изделий.
Адрес:
Витебская обл., г. Полоцк, ул. Гагарина, 1.
Земельный участок 243500000004000885, 0,1269 га.
Право аренды.
Начальная цена с НДС 20 % – 40,00 руб.
Задаток – 40,00 руб. Шаг аукциона – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, определения лица, выигравшего аукцион, а также условия аукциона содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by).

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений и задатка – 12.09.2024 в 11.00.

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

**Организатор торгов – частное предприятие «ПАКУМ» извещает о проведении повторных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ликвидируемого юридического лица –**
**ООО «ТАГАСТРОЙПЛЮС».**
**Аукцион состоится 12.09.2024 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Смолячкова, 9, каб. 426**

| № лота | Наименование лота | Начальная цена лота без НДС, руб. | Шаг торгов 5 %, руб. | Задаток 5 %, руб. |
|---|---|---|---|---|
| 2 | Офисная мебель и оборудование, стройматериалы в ассортименте | 19 000,00 | 950,00 | 950,00 |

| | |
|---|---|
| **Продавец** | ООО «ТАГАСТРОЙПЛЮС», тел. +375291307853 |
| **Организатор торгов** | Частное предприятие «ПАКУМ», г. Минск, ул. Смолячкова, 9-426, тел. +375293321936 |
| **Реквизиты для оплаты задатка** | Частное предприятие «ПАКУМ», УНП 191274798, р/с BY58BPSB30121044660169330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска, БИК BPSBBY2X |

Заявки на участие в торгах принимаются организатором торгов по месту проведения торгов **в срок до 15.00 11.09.2024.**
Подробная информация о составе лота, порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения и определения лица, выигравшего аукцион, содержатся на сайте организатора аукциона – https://pakum.by/auction

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего
**ОАО «Премьерлизинг»** (Продавец).

**Электронные торги состоятся 02.10.2024.**

**Лот № 1:** торговый комплекс
с инв. № 200/D-168451, 1599,8 кв. м.

Адрес: Витебская область, г. Витебск, ул. Богатырева, 8А-3.

Торговый комплекс с инв. № 200/D-168451 находится в капитальном строении с инв. № 200/С-81193, расположенном на земельном участке 240100000001009153 площадью 0,2152 га.
Право аренды. Доля: 9/10

Обременения: ипотека, аренда, сервитут.

Подписание договора купли-продажи и его регистрация возможны только при условии получения согласия залогодержателя по договору об ипотеке.

Организатор электронных торгов и Продавец не несут ответственности за незаключение договора купли-продажи с Победителем электронных торгов (Претендентом на покупку) по причине, вызванной обстоятельствами, изложенными выше.

Начальная цена с НДС 20 % – 1 384 586,40 долларов США.
Задаток – 440 672,31 руб.
**Шаг электронных торгов** – 2 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП). Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 27.09.2024 в 16.00.

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки)
информирует о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего
**РУП «Белоруснефть-Минскоблнефтепродукт»** (Продавец).

**Электронные торги состоятся 17.09.2024.**

**Лот № 1:**
зерноуборочный комбайн (кат. D),
модель КЗС-1218-10, заводской № 03323.

Начальная цена без НДС – 43 600,00 руб.
Местонахождение Лота № 1:
Минская обл., Логойский р-н, аг. Гостиловичи.

Извещение о проведении электронных торгов размещено на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и на электронной торговой площадке «GOSTORG» gostorg.by.

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего
**ОАО «Премьерлизинг»** (Продавец).

**Электронные торги состоятся 02.10.2024.**

**Лот № 1:** магазин «Универсам»
с инв. № 200/С-55222, площадь – 942,8 кв. м.

Адрес: Витебская область, г. Витебск, ул. Лазо, д. 129А.
Земельный участок № 240100000001002906, 0,3738 га.
Право постоянного пользования.

Обременения: ипотека, аренда.

Подписание договора купли-продажи и его регистрация возможны только при условии получения согласия залогодержателя по договору об ипотеке.

Организатор электронных торгов и Продавец не несут ответственности за незаключение договора купли-продажи с Победителем электронных торгов (Претендентом на покупку) по причине, вызванной обстоятельствами, изложенными выше.

Начальная цена с НДС 20 % – 899 833,20 долларов США.
Задаток – 286 389,91 руб.
**Шаг электронных торгов** – 2 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП). Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 27.09.2024 в 16.00.

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182

Год якасці

# НА ПАРТАЛЕ «КАЧЕСТВО.БЕЛ» 90 ТЫСЯЧ ВІДАЎ ПРАДУКЦЫІ І ІХ ВЫТВОРЦАЎ

У сучасных умовах якасць — вызначальны арыенцір канкурэнтнай устойлівасці эканомікі краіны ў цэлым і кожнай арганізацыі паасобку, лічаць у Дзяржстандарце. Якасць з'яўляецца галоўным крытэрыем, па якім спажывец выбірае прадукцыю. Важным крокам на шляху лічбавага развіцця Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі нашай краіны стаў інтэрнэт-партал «Качество.бел», які быў запушчаны ў 2019 годзе.

У аснове інтэрнэт-партала — Дзяржаўны каталог прадукцыі, які фарміруецца ў рамках функцыянавання з 1997 года дзяржаўнай сістэмы каталагізацыі прадукцыі. Каталог акрамя назвы прадукцыі і даных аб вытворцы змяшчае тэхнічныя характарыстыкі і ўласцівасці прадукцыі, устаноўленыя ў дзяржаўных стандартах і тэхнічных умовах.

На сёння ў Дзяржаўным каталогу прадукцыі ўтрымліваюцца звесткі пра больш чым 89 тысяч відаў прадукцыі і каля 14,5 тысячы вытворцаў. Штомесяц у яго ўключаецца больш за 300 новых відаў прадукцыі, абнаўляюцца дадзеныя па 500 яе назвах.

Для падтрымкі вытворчасці айчыннай прадукцыі на гэтым партале размешчаны тэматычныя каталогі, а таксама сфарміраваны каталогі прадукцыі ў разрэзе ведамаснай прыналежнасці і тэрытарыяльнага размяшчэння прадпрыемстваў.

На партале звесткі аб прадукцыі, уключанай у Дзяржаўны каталог, інтэгруюцца са звесткамі з такіх дзяржаўных інфармацыйных рэсурсаў, як Нацыянальная частка адзінага рэестра выдадзеных сертыфікатаў адпаведнасці і зарэгістраваных дэкларацый аб адпаведнасці, рэестр нацыянальнай сістэмы пацвярджэння адпаведнасці, рэестр сертыфікатаў «Натуральны прадукт», рэестр вытворцаў арганічнай прадукцыі, небяспечная прадукцыя, конкурсы рух.

Такім чынам, «Качество.бел» — карысны рэсурс, які змяшчае сканцэнтраваную інфармацыю аб айчыннай прадукцыі, у тым ліку яе якасных характарыстыках, а таксама вытворцах.

**Сяргей КУРКАЧ.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона)
по поручению **филиала «Воложинское» открытого акционерного общества «Агрокомбинат «Дзержинский»** (продавец)
проводит открытый аукцион

**по продаже ангара (пилорамы)**
**с инв. № 632/С-32667, общей площадью 685,7 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 622085715607000097, площадью 0,4220 га**
***(право постоянного пользования),***
**по адресу: Минская область, Воложинский район, Раковский с/с, аг. Раков, пер. Северный, 3.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: водоохранная зона, пл. 0,4220 га; охранная зона электрических сетей, пл. 0,0390 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) **– 118 257,22** бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены **– 11 825,00** бел. руб.

Объект обременен договорами аренды (дополнительные сведения у организатора аукциона).

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **02.10.2024** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **30.09.2024** до **17.00** по указанному адресу **в каб. 320.**

**Тел.: (8017) 516-80-64, 516-80-65, (8029) 136-31-11, 102-21-17.**
**Тел. для осмотра: (8017) 504-83-58, (8029) 113 18 61.**

УНП 601088558

**Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»** извещает об отмене открытого аукциона по продаже капитального строения с инвентарным номером 161/С-20596 (наименование: жилой дом; назначение: здание одноквартирного жилого дома), площадью 46,9 кв. м, расположенного по адресу: Брестская обл., Каменецкий р-н, Волчинский с/с, д. Волчин, ул. Ленина, 52, принадлежащего ОАО «Беловежский», в соответствии с извещением, опубликованным в газете «Звязда» за 30.07.2024.

УНП 201028245

**Считать недействительными** утерянные ЗАО «СК «Белросстрах» бланки страховых полисов: ***«Добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу» форма 2РН, 2РП серия БИ*** **№ 1791430 – 1 шт., № 1875022 – 1 шт., № 1890022 – 1 шт.**

УНП 100782388

# ІНЖЫНЕРЫ ЧАЛАВЕЧЫХ ДУШ

## Якія задачы ставіць час перад пісьменнікамі?

**Традыцыйны міжнародны пісьменніцкі круглы стол, які праходзіць у межах свята беларускага пісьменства, сёлета сабраў у Палацы Рэспублікі прадстаўнікоў Беларусі, Расіі, Казахстана, Азербайджана, Узбекістана, Кітая. Арганізатарамі сустрэчы выступілі Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь і Саюз пісьменнікаў Беларусі.**



Фота Канстанціна ДРОБАВА.

У гэтым годзе дэвіз круглага стала — «Час выбраў нас» — вызначаў тэмы, што абмяркоўвалі эксперты. Іх на пачатку сустрэчы агучыў **старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь КАРЛЮКЕВІЧ.** Удзельнікі гаварылі пра ролю пісьменніка, яго грамадзянскую адказнасць, праўду жыцця і літаратуры, самацэнзуру, пошук праўдзівых і актуальных вобразаў і сімвалаў, сацыяльныя сеткі, якія, безумоўна, сёння ўплываюць на грамадства і ставяць перад літаратарамі новыя пытанні.

«Сёння запатрабаваны пісьменнікі, творчасць якіх адпавядае часу і тым ідэям, якія складваюцца ў грамадстве і фарміруюць розныя сацыяльныя асяроддзі; тыя пісьменнікі, якія паказваюць сваю пазіцыю і вызначаюць сваё месца побач з дзяржавай і народам. Час выбраў такіх людзей», — упэўнены Алесь Карлюкевіч.

### ВЯРТАННЕ ІДЭАЛАЎ

Штогадовы ўдзельнік круглых сталоў «Пісьменнік і час», **доктар філалагічных навук, прафесар, акадэмік Сербскай акадэміі навук Іван ЧАРОТА** звярнуў увагу, што вельмі важна ў дыскусіі не сысці на развагі пра абранасць пісьменніка як аб'екта для пакланення: «Час выбраў нас не для забаў, а для таго, каб указаць нам, пісьменнікам, на нашу адказнасць перад народам, грамадствам, дзяржавай. Менавіта ў гэтым наша адказнасць. Прычым адказнасць за ўсё, што адбывалася, адбываецца і будзе адбывацца... Народы і грамадства зусім не тое, што яны думаюць пра сябе ў часе, а тое, што Творца думае пра іх у вечнасці. Нам, інжынерам чалавечых душ, пра гэта трэба памятаць пастаянна».

Тут важна бачыць перспектыву. Іван Чарота згадаў словы Маршака пра тое, як за будкай, што знаходзіцца побач, можна не заўважыць удалечыні вежу ці замак. Такая перспектыва бачання — таксама складнік абранасці пісьменнікаў. Вельмі важным застаецца пошук ідэалаў, пра што раней гаварылі такія пісьменнікі, як Тургенеў і Майкоў. На жаль, у часы перабудовы, у часы новых выгод, мы страцілі многія каштоўнасці, якія мелі, напрыклад, такія як братэрства: «Нам была навязана адмова ад ідэальнага. Нам унушылі, што мы жывём у час постсавецкі, посттаталітарны, а, па вялікім рахунку, гэта была постгісторыя, постграмадства — усё «пост», і мы палічылі, што гэта для нас прымальна».

### АДЛЮСТРАВАННЕ ГІСТОРЫІ

Удзельнікі круглага стала гаварылі і пра тое, што дзякуючы пісьменнікам многія чытачы пазнаюць гісторыю. У прыватнасці, **кіраўнік Віцебскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Тамара КРАСНОВА-ГУСАЧЭНКА** заўважыла, што знікалі імперыі, але заставалася літаратура, якая расказвала пра розныя гістарычныя эпохі. Наогул, яна ўпэўнена, што сёння пісьменнік не толькі выхоўвае ў чалавеку густ, высокія маральныя якасці, але і ўплывае на развіццё іншых галін, у тым ліку эканомікі, садзейнічае развіццю грамадства, бо высокаадукаваныя асобы не здольны на подласць і здраду, служаць умацаванню міру.

«Час сёння такі, што складана не спыніцца і не падумаць аб тым, што праўда жыцця, праўда літаратуры — гэта, у першую чаргу, гісторыя дзяржавы, а значыць, і гісторыя развіцця чалавека. Хто скажае гісторыю, той разбурае дзяржаву», — упэўнены **народны пісьменнік Беларусі Мікалай ЧАРГІНЕЦ.** На яго думку, пісьменнік павінен вельмі адказна ставіцца да таго, якую тэму выбіраць для сваіх твораў: «Нярэдка можна чуць выраз, што сёння не чорт спакушае чалавека, а чалавек спакушае чорта. За гэтым стаіць вялікая адказнасць пісьменніка за сваю творчасць, за тое, што ён паказвае і прад'яўляе народу. Трэба думаць пра тое, якую карысць ты прынясеш грамадству, народу і нават міжнароднай супольнасці... Мы служым і для таго, каб вырасціць падрастаючае пакаленне. Мала пакінуць дзецям імя па бацьку — трэба пакінуць і Айчыну. Кнігі іграюць у гэтым вялікую ролю».



### ВЫХАВАННЕ ЧЫТАЧА

**Першы намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Андрэй КУНЦЭВІЧ** заўважыў, што круглы стол пісьменнікаў — гэта цудоўная магчымасць для абмену вопытам, пошуку шляхоў вырашэння праблем, агульных для літаратараў розных краін, пашырэння магчымасцяў для зносін і ўмацавання творчых сувязяў пісьменнікаў. Таксама ён звярнуў увагу, што ў нашай краіне створаны ўмовы для шырокай папулярызацыі літаратуры, напісання твораў высокага мастацкага ўзроўню, развіцця і ўмацавання міжнародных літаратурных кантактаў. Так, беларускія кнігі перакладаюцца на 25 моў свету.

Штогод у Беларусі выходзіць каля васьмі тысяч найменняў кніг і брашур тыражом звыш 20 мільёнаў экзэмпляраў. Гэта больш за дзве кнігі на аднаго жыхара краіны. Асаблівая ж увага — дзіцячаму кнігавыданню, колькасць выданняў для дзяцей і юнацтва пастаянна павялічваецца. Напрыклад, у мінулым годзе прырост быў на 8 працэнтаў па колькасці назваў і на 28 працэнтаў па тыражы. Сярэдні тыраж аднаго выдання складае 3200 экзэмпляраў. Дзяржава аказвае значную дапамогу для развіцця галіны. З рэспубліканскага бюджэту на выпуск сацыяльна значных выданняў і іх дастаўку ў бібліятэкі штогод выдзяляецца больш чым два мільёны рублёў субсідый. Па даручэнні кіраўніка краіны здзяйсняецца выпуск літаратурна-мастацкіх твораў сучасных аўтараў на бязвыплатнай аснове ў публічныя бібліятэкі. Так, з 2012 года ўжо перададзена больш чым 160 найменняў кніг з творамі сучасных беларускіх аўтараў. Таксама на бязвыплатнай аснове пастаўляюцца кнігі серыі «Школьная бібліятэка» ва ўстановы адукацыі. За чатырнаццаць гадоў у гэтай серыі выпушчана больш як 170 найменняў кніг агульным тыражом каля чатырох мільёнаў экзэмпляраў.

«Праблема грамадзянскай адказнасці пісьменніка цяпер, як ніколі, актуальная. Асабліва гэта датычыцца дзіцячай літаратуры, бо слова можа нанесці вялікую траўму, можа выхаваць чалавека героем альбо мярзотнікам, які будзе паўсюль ганіць сваю краіну. Таму, калі гаворым пра дзіцячую літаратуру, то самацэнка пісьменніка і самарэдактура — вельмі важныя складнікі яго дзейнасці... Пісьменнікі павінны ўсведамляць сваю адказнасць. Дзеці — наша будучыня: якімі іх выхаваюць нашы кнігі, такім будзе заўтра, такую краіну мы атрымаем», — заўважыла вядомая **расійская пісьменніца, вучоны, педагог Лілія КАНДЫБОВІЧ.** У Расіі тры гады таму быў створаны Саюз дзіцячых і юнацкіх пісьменнікаў. Ён аб'ядноўвае аўтараў, якія пішуць «правільныя кнігі», гавораць пра каштоўнасці, прычым работа ў гэтым кірунку вядзецца разам з Інстытутам выхавання. «Не трэба забываць, што дзеці растуць у грамадстве, дзе існуюць розныя праблемы», — заўважыла пісьменніца, і яна ўпэўнена, што складаныя пытанні таксама важна ўздымаць, але пры гэтым адчуваць тую грань, якая дазволіць раскрыць іх і пры гэтым не нанесці шкоду дзіцячай псіхіцы. З такой задачай аўтар сутыкнулася пры рабоце над кнігай «Тата вернецца, Лёва», у якой расказваецца пра Вялікую Айчынную вайну, эвакуацыю беларускіх дзяцей. Тут яна пастаралася паказаць, што перажылі прабабулі і прадзядулі сучасных дзяцей, зрабіць акцэнт не на жахі вайны, а на тое, якую дапамогу аказвалі прадстаўнікі розных нацыянальнасцяў. Гэта кніга і пра любоў да сваіх продкаў, і падстава для дзяцей задумацца, як бы яны маглі паступіць у складаных сітуацыях.

Падчас круглага стала пісьменнікі закранулі пытанне, якой павінна быць сучасная дзіцячая літаратура. Тое, што падабалася ранейшаму пакаленню, можа быць нецікавым юнаму чытачу сёння. Усё ж раней малыя жылі ў іншых рэаліях і рытмах, мелі больш часу, не былі настолькі загружанымі. Таму ім больш падыходзіць літаратура, якая стваралася менавіта пад іх.

Пра тое, наколькі важна знаёміць юную аўдыторыю з сучаснымі літаратурнымі здабыткамі, гаварыла **ўзбекская пісьменніца і перакладчыца Рысалат ХАЙДАРАВА.** Ва Узбекістане запушчаны праект па стварэнні стагомніка сусветнай дзіцячай літаратуры, куды ўвойдуць творы, напісаныя за апошнія 30 гадоў. Мяркуецца, што там будзе і беларускі том, і, хутчэй за ўсё, не адзін. У мінулым годзе ў часопісе, які выходзіць у Ташкенце і знаёміць з сусветнай літаратурай, быў надрукаваны пераклад аповесці «Сівая легенда» Уладзіміра Караткевіча на ўзбекскую мову. Твор вельмі спадабаўся чытачам Узбекістана. «Трэба пашыраць літаратурныя сувязі. Незалежна ад таго, на якой мове пішуць аўтары, яны гавораць пра агульныя чалавечыя каштоўнасці», — упэўнена Рысалат Хайдарава.

### ПОШУК НОВЫХ ФОРМ

У круглым стале бралі ўдзел аўтары, якія спрычыніліся таксама да стварэння фільмаў. Сярод іх і **Вячаслаў БАНДАРЭНКА**, дзякуючы якому з'явіўся фільм пра сувязі беларускага і кітайскага народаў. «Нам удалося адкрыць невядомыя старонкі супрацоўніцтва нашых народаў. Мы расказалі гісторыю віцебскіх падпольшчыкаў кітайскай нацыянальнасці, якія змагаліся ў гады Вялікай Айчыннай вайны, а таксама гісторыю першага і адзінага лётчыка-штурмавіка на нашым фронце, кітайца па нацыянальнасці», — падзяліўся пісьменнік.

Але на круглым стале ён варушыў узняць тыя пытанні, якія чуў падчас сустрэч з чытачамі ў розных гарадах і краінах. Так, часта ўзнімалася праблема, што людзі сёння аддаюць перавагу сацыяльным сеткам, а не кнігам. Відаць, сёння трэба ствараць вобраз чытача як чалавека шчаслівага, гатовага дзяліцца сваімі адкрыццямі. «Чытанне — працэс адзінокі, не публічны. А цяпер гэта не модна. Добра, што апошнім часам з'яўляюцца месцы, дзе можна за кавай сядзець з кнігай у атачэнні іншых такіх жа чытачоў», — заўважыў Вячаслаў Бандарэнка. Яшчэ адна праблема, якая ўсплывае на сустрэчах з чытачамі, датычыцца канфліктаў у літаратуры. Людзі прызнаюцца, што ім хочацца чытаць пра тое, што ўсё добра. «Гэта сведчанне стомленасці сучаснага чалавека і яго запытаў на забавы, — упэўнены пісьменнік. — Але трэба быць сумленнымі і прызнаць, што сапраўдная літаратура адносін да забаў не мае. Гэта заўсёды драма, канфлікт, траўма. Забаўляць пісьменнікі не павінны, яны павінны задаваць людзям пытанні, у тым ліку і дастаткова няёмкія».

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# «І НА БРАНІ ЛІПОВЫ

## Чым адметны зборнік

**Сёлета Дзень беларускага пісьменства праходзіць у Івацэвічах. Гэта дваццаць сёмая сталіца свята, якое адбудзецца трыццаць першы раз, — некаторыя гарады па некалькі разоў рабіліся яго сталіцай, такія як славутыя сваёй гісторыяй Полацк, Тураў, Заслаўе. Але і Івацэвіччыне ёсць чым ганарыцца... Каб у гэтым пераканацца, варта пазнаёміцца з чарговым зборнікам серыі «Беларусь літаратурная» выдавецтва «Мастацкая літаратура». У гэтай серыі да кожнага Дня беларускага пісьменства выходзіць новая кніга. Укладальнік зборніка — паэт, намеснік дырэктара «Мастацкай літаратуры» Віктар Шніп. Разам з ім паспрабуем зразумець, чым адметны зборнік і чаму варта з ім пазнаёміцца.**

### 1. АД П'ЕСЫ ДА ВЕРША: ГЕРОІ САВЕЦКАГА САЮЗА Ў ЯКАСЦІ ЛІТАРАТУРНЫХ ГЕРОЯЎ

— *Гэты год праходзіць пад знакам 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, і для Дня беларускага пісьменства тэма стане магістральнай. Таму зборнік, прысвечаны літаратурнай Івацэвіччыне, атрымаўся незвычайны,* — распавядае Віктар Анатольевіч. — *Ён называецца «Мы помнім...». У ім ёсць раздзел «Нашы героі» — гэта фактычна першая спроба анталогіі твораў беларускіх пісьменнікаў, героямі якіх сталі Героі Савецкага Саюза. Усяго дваццаць персаналій. Аўтары твораў — пісьменнікі розных пакаленняў, якія стваралі ў розных жанрах: вершы, паэмы, апавяданні, раманы, п'есы, эсэ. Штосьці з тэкстаў вядомае, штосьці стане для чытача адкрыццём.*

Некаторыя творы даюцца ва ўрыўках, некаторыя — цалкам. Напрыклад, цалкам друкуецца п'еса Аркадзя Маўзона «Канстанцін Заслонаў», гераічная драма ў 3-х дзеях, 12 карцінах, напісаная ў 1947 годзе. П'еса, прысвечаная легендарнаму беларускаму партызану, была пастаўлена ў многіх гарадах СССР. А ў 1949-м па ёй быў зняты знакаміты фільм, які ў тым жа годзе паглядзелі 17,9 млн гледачоў. Вось з рамана Івана Шамякіна «Сэрца на далоні» прыводзіцца толькі адзін раздзел. Прататыпам аднаго з герояў, доктара Савіча, стаў Яўген Клумаў, беларускі ўрач, удзельнік Мінскага падполля, закатаваны фашыстамі. Перадаюць атмасферу ваеннага часу творы, напісаныя па гарачых слядах падзей, у час вайны. Напрыклад, у 1942 годзе Пятрусь Броўка стварыў «Паэму пра Смалячкова». Друкуюцца і два эсэ Кузьмы Чорнага — пра Ціхана Бумажкова і Льва Даватара. Кузьма Чорны да Перамогі не дажыў, памёр у 1944-м. Але ў яго творах гучыць непахісная вера ў Перамогу. Ёсць у зборніку і эсэ «Легендарны звяздовец Уладзімір Амельянюк», пра аднаго з кіраўнікоў антыфашысцкага падполля ў Мінску, першага рэдактара падпольнай газеты «Звязда». Аўтар — журналістка сучаснай «Звязды» Вераніка Канюта.

Цікава, што акрамя герояў-людзей у раздзеле ёсць і іншыя героі... Гэта Брэсцкая крэпасць, пра якую пісаў удзельнік яе абароны Сяргей Смірноў, і Мінск. Зборнік заканчваецца вершам Анатоля Вялюгіна «Трэцяе ліпеня», у якім паэт згадвае, як ва Уральскім шпіталі даведаўся пра вызваленне Мінска:

*На мыліцах рыпучых, групай,*
*забыўшы свой шпітальны лёс,*
*мы абкружылі шумна рупар*
*і не саромеліся слёз.*
*Склікалі маршы нас на свята;*
*здаецца, бачыў цэлы свет*
*чырвоны сцяг*
*над роднай хатай*
*і на брані ліповы цвет.*

### 2. «ПАРТИЗАНЫ ИЗ КОРЫ ВЫРЕЗАЛИ ДЛЯ ПЕРВОКЛАССНИКОВ БУКВЫ ДЛЯ АЗБУКИ»: ЗНАХОДКІ КРАЯЗНАЎЦАЎ

— *Зборнік «Мы помнім...» — не проста анталогія літаратурных твораў. Гэта яшчэ і плён працы даследчыкаў літаратуры, гісторыкаў, краязнаўцаў,* — кажа Віктар Шніп. — *Сярод іншага звярніце ўвагу на артыкулы загадчыка мемарыяльнага комплексу партызанскай славы «Хаваншчына» Сяргея Мачалава, краязнаўца з Івацэвіч. Я сам даведаўся шмат новага і ўражлівага.*




Адзін з артыкулаў распавядае пра лясныя школы, якія ладзіліся ў партызанскіх атрадах. Толькі ў Брэсцкай вобласці на 1 мая 1944 года ў такіх школах вучылася 490 дзяцей: «...при изготовлении письменных принадлежностей партизаны из коры вырезали для первоклассников буквы для азбуки, из веточек делали классные счеты, для письма готовили кусочки березовой коры. Народные умельцы нашли способ изготовления чернил: делали отвар из дубовых желудей, бросали туда ржавый гвоздь или кусок железа. Некоторое время эта смесь отстаивалась, и получались чернила».

У артыкуле прыводзяцца ўспаміны Тацціяны Кот пра такую школу ў атрадзе імя Калініна брыгады імя Дзяржынскага: «Бумаги, карандашей и чернил не хватало. Мы писали палочками на песке. Потом ухитрились писать угольком на березовой коре».

Нельга абыякава чытаць справаздачу наконт дзейнасціляснай школы атрада імя Кірава брыгады імя Панамарэнкі, якую ў чэрвені 1944 года склалі дзве маладыя настаўніцы, Марыя Шляхценка і Любоў Грыцова:

*«Детей школьного возраста — 58, из них ранее посещало школу — 28 (1-й, 2-й, 3-й классы). Охвачено обучением сейчас мальчиков — 37 и девочек — 21... Наглядных пособий нет. Учебных пособий также не имеется, за исключением некоторых рассказов и газетных статей... Выучены на память стихи «Наша жизнь», «Бомбардировка», «Учиться», «Весна», «Баллада о четырех заложниках» и др».*

Да вызвалення маладыя настаўніцы не дажылі зусім крыху... У ноч з 3 на 4 ліпеня 1944 года, якраз калі Мінск вітаў сваіх вызваліцеляў, на партызанскі атрад была скінута бомба... Адзін самалёт, адна бомба... І якраз трапіла ў зямлянку настаўніц.

Марыя Шляхценка пісала вершы. Сяргей Мачалаў цытуе адзін з іх: *«Только солнце встает над землею // И рассеется серый туман, // Под кудрявой зеленой сосною // Учатся дети семей партизан».*

### 3. ТАЯМНІЦА СКАРОЧАНАЙ ПАЭМЫ: ФАКТЫ ПРА ПІСЬМЕННІКАЎ

— *У зборніку «Мы помнім...» можна даведацца не толькі пра герояў тэкстаў, але і пра аўтараў,* — кажа Віктар Анатольевіч. — *Часам за адказам на пытанне, чаму пісьменнік ці паэт звярнуўся да постаці пэўнага героя, хаваецца цэлая гісторыя. Напрыклад, у зборніку прыводзіцца верш Веры Вярбы пра Веру Харужую. Гэта невыпадкова — Вера Харужая была ідэалам для паэткі, сапраўднае імя якой Гертруда Сакалова. Псеўданім Вера Вярба яна ўзяла ў гонар Веры Харужай. У адным з вершаў пісала: «Я іду па слядах тваіх // за справядлівасцю і муж-*

# ВЕРУ НЕ ПЕРАМАГЧЫ ЗЛОМ

## Віктар Праўдзін прэзентуе свой новы раман

**У праграме Дня беларускага пісьменства ў Івацэвічах — сустрэчы з тымі, хто ў мінулыя гады атрымаў Нацыянальную літаратурную прэмію. Сярод нядаўніх лаўрэатаў — і вядомы пісьменнік Віктар Праўдзін, які ў Івацэвічах прадстаўляе свой новы раман. Пра што гэты твор, чым адметны для пісьменніка, Віктар Праўдзін расказвае чытачам «Звязды».**




— У выдавецтве «Мастацкая літаратура» толькі што выйшаў асобнай кнігай мой раман «Непераможны злом», які паеду прэзентаваць у Івацэвічы. Раман прысвечаны апошняму месяцу жыцця свяшчэннамучаніка Канстанціна Жданава. Тэма невыпадковая, бо падзеі адбываліся ў Шаркаўшчыне, любым мне куточку, дзе прайшло юнацтва, дзе я пачаў працу, дзе і цяпер жыву. У 1912 годзе іерэй Канстанцін Жданаў, мясцовы ўраджэнец, пабудаваў там новую царкву Успення Прасвятой Багародзіцы. Прыгожую, з залатымі купаламі. Мясцовыя жыхары рабілі ўнёскі на будаўніцтва, святар шукаў фундатараў у Маскве і Санкт-Пецярбургу. Да гэтага чатыры разы прасіў у вышэйшага свайго начальства дазвол на будаўніцтва, бо папярэдняя царква была пабудавана ў Шаркаўшчыне яшчэ Львом Сапегам. За трыста гадоў будынак прыйшоў у заняпад, сцены падпіралі дубовымі бярвеннямі. Царкву ўзвялі. А ў 1919 годзе прыйшла новая ўлада. Шаркаўшчына тады ўваходзіла ў Дзісненскі павет, і з начальствам ёй не пашанцавала. Мясцовую савецкую ўладу ўзначаліў чалавек несумленны, па прозвішчы Маляўка, які толькіназываў сябе бальшавіком і каля сябе сабраў такіх жа прайдзісветаў. Даходзіла да таго, што ён сек на вуліцы прынародна розгамі жанчын і дзяцей. Многа чаго рабілася бесчалавечнага. І людзі цягнуліся да мясцовага бацюшкі, Канстанціна Жданава, што, вядома, начальству не падабалася. Маляўка скарыстаў тое, што царкоўны староста скраў з царкоўнай казны 1201 рубель. Бацюшка Канстанцін звярнуўся да ўлады, каб разабрацца, але ўсё перавярнулі так, што Маляўка абвінаваціў бацюшку ў контррэвалюцыйнай дзейнасці. Канстанціна Жданава арыштавалі, завезлі ў Дзісну, месяц пратрымалі ў турме і асудзілі на расстрэл разам з яшчэ васьмю чалавекамі. Потым высветлілася, што айца Канстанціна закапалі яшчэ жывога, толькі параненага ў нogi, ён спрабаваў выбрацца з магілы, але не змог, задыхнуўся. Падзеі страшнага расстрэлу ў Дзісне справакавалі паўстанне ў суседніх Германавічах, калі тры тысячы чалавек паўсталі супраць новай улады. Я вывучаў лёсы і тых васьмі чалавек, якія былі асуджаны на смерць разам з айцом Канстанцінам. Напрыклад, мясцовыя памешчыкі, муж і жонка. Ім прапаноўвалі аддаць маёмасць і з'ехаць, тыя не пагаджаліся. Тады напісалі данос, што ў іх двое сыноў-белагвардзейцаў, якія ваююць цяпер на фронце супраць савецкай улады. Сужэнцаў прысудзілі да расстрэлу — хаця ў іх зусім не было сыноў. Расстралялі сярод тых васьмярых і бальшавіка Завадскага з Празарок, які выступіў супраць самаўпраўства мясцовай улады. Ён — бальшавік з 1903 года і ўсяго толькі назваў следчага хлопчыкам — маўляў, ты хлопчык у параўнанні са мной.

***— Гэта ўсё рэальныя персанажы... Ваш раман дакументальны?***

— Там шмат дакументальнага. Я вывучаў пратаколы следства, якое вялося, калі да ўлады ў раёне прыйшлі сапраўдныя камуністы і пачалі расследаванне злачынстваў папярэднікаў. Усе прахіндзеі на чале з Маляўкам былі арыштаваны і адпраўлены ў Віцебскую турму. Як, прыкладам, не скарыстаць было такі вычытаны ў дакументах факт: прыязджае Маляўка ў вёску, вісіць на вяроўках мокрая спадняя жаночая бялізна... Ён здымае, кладзе сабе ў торбу — і пайшоў. Але раман — найперш мастацкі твор, хоць пабудаваны на гістарычных звестках. Асабліва дапамагла кніга, падрыхтаваная па благаславенні і пад кіраўніцтвам епіскапа Полацкага і Глыбоцкага Ігнація «Што Бог пашле, тое і буду трываць». Назва — гэта апошнія словы, якія сказаў Канстанцін Жданаў. Калі яго з іншымі вялі на расстрэл, з'явілася магчымасць збегчы: у расстрэльнай камандзе ўсе былі п'яныя, і адзін з вязняў, таксама святар, прапанаваў уцёкі. А айцец Канстанцін Жданаў вось такімі словамі адмовіўся. Я два з паловай года збіраў звесткі пра падзеі тых часоў. З майго рамана чытач зразумее, што не кожнага можа перамагчы зло — святы пакутнік бацюшка Канстанцін Жданаў застаўся непераможаны.

***— Вы сказалі, што ваш твор пра апошні месяц жыцця свяшчэннамучаніка Канстанціна Жданава. Але ён правёў яго ў турме. Там усё і адбываецца?***

# ЦВЕТ...»

## «Мы помнім...»

*насцю, // За высокай гордасцю і дружнасцю. // Кожны крок мой — на белай паперы, // Я дайду да цябе, мая Вера!»*

Безумоўна, зацікавіць яшчэ адзін артыкул Сяргея Мачалава пра таямніцу «Балады пра чатырох заложнікаў» Аркадзя Куляшова — менавіта гэты твор вучылі ў партызанскай школе з дзецьмі маладыя настаўніцы Марыя Шляхценка і Любоў Грыцова. На лістах, вырваных з нямецкага ўліковага журнала, на беларускай мове паўзверх нямецкага гатычнага шрыфту нехта з вучняў лясной школы напісаў план «Балады». Паводле таго плана, у ёй было на дванаццаць радкоў больш, чым мы ведаем. Чаму? Сяргей Мачалаў высветліў, што сам аўтар скараціў сваю паэму пасля вайны. Прычына тлумачыцца ва ўспамінах дачкі паэта Валянціны Куляшовай — Аркадзь Куляшоў спрачаўся з жонкай наконт трактоўкі абставін подзвігу бацькі Міная.

### 4. АД ПЕРШЫХ ПАСЕЛІШЧАЎ ДА АЛЕІ АДМІРАЛАЎ: ГІСТОРЫЯ ІВАЦЭВІЦКАГА РАЁНА

Сёння ў праграме Дня беларускага пісьменства ў Івацэвічах — традыцыйная навукова-практычная канферэнцыя, якая сёлета называецца «Івацэвіцкія чытанні». Мэта форуму — распавесці як мага шырэй пра гісторыю і культуру Івацэвіцкага краю.

*— Мы таксама пастараліся, каб чытач нашага зборніка больш даведаўся пра Івацэвічыну,* — тлумачыць Віктар Шніп. — *Сярод іншага змяшчаем храналогію «Гісторыя Івацэвіцкага раёна», пачынаючы ад X—IX тысячагоддзя да н. э., калі ля Бабровіцкага возера з'явіліся першыя паселішчы чалавека, і заканчваючы нашым часам. Асобна вылучана храналогія часоў Вялікай Айчыннай вайны, дзе можна даведацца і пра подзвігі беларускіх партызан і падпольшчыкаў, і пра зверствы нямецка-фашысцкіх акупантаў. Першыя партызанскія групы ў Івацэвіцкім раёне з'явіліся ўжо ў ліпені 1941 года, у кастрычніку ўжо стварылася Косаўская антыфашысцкая арганізацыя. А 3 жніўня 1942 г. партызаны атрадаў імя Дзімітрава, Варашылава, Шчорса ўчынілі штурм Косава.*

Цікавымі падзеямі адзначана і Івацэвічына нашага часу. Напрыклад, у 2022 годзе ў Івацэвічах адбылося адкрыццё Алеі адміралаў зямлі беларускай, 6—15 верасня 2023-га. прайшоў марафон «17 граняў адзінства», прысвечаны Дню народнага адзінства, у гэтым годзе адкрылі скульптурную кампазіцыю памяці спаленых вёсак. Зразумела, увойдзе ў гісторыю Івацэвіч гэты год і правядзеннем XXXI Дня беларускага пісьменства.

### 5. АД КЛАСІКАЎ ДА СУЧАСНІКАЎ: ТВОРЧАСЦЬ ІВАЦЭВІЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ

*— Зборнікі серыі «Беларусь літаратурная» прадстаўляюць літаратурнае жыццё той ці іншай мясцовасці,* — расказвае Віктар Шніп. — *І гістарычную спадчыну, і класікаў, і сучасных аўтараў, да самых маладых. Сярод івацэвіцкіх літаратараў — такія вядомыя асобы, як Піліп Пестрак і Яраслаў Пархута. Ёсць і менш вядомыя, напрыклад, Баляслаў Пачопка, які разам з Алаізай Пашкевіч (Цёткай) адкрываў беларускія школы, працаваў дырэктарам Свіслацкай беларускай настаўніцкай семінарыі, а ў 1918 годзе склаў першую «Граматыку беларускай мовы».*

Уразіць чытача і знаёмства з асобай і творчасцю Анатоля Галушкі, які праз траўму пазваночніка на ўсё жыццё стаў інвалідам.

*«Пачаў маляваць зубамі. Першы малюнак быў выкананы звычайным алоўкам на аркушы паперы... З часам стварыў сваю тэхніку жывапісу, у нечым унікальную — пісаў, сціскаючы пэндзаль у зубах, кароткімі штрышкамі».*

Анатоль Галушка здабыў вядомасць як мастак, але яшчэ пачаў пісаць вершы на беларускай мове. У ліпені 2013 г. быў прыняты ў Саюз пісьменнікаў Беларусі, у 2017-м за зборнік вершаў, эсэ, замалёвак «Яблычны Спас» стаў лаўрэатам літаратурнай прэміі імя У. А. Калесніка Брэсцкага аблвыканкама.

Зборнік «Мы помнім...» выдавецтва «Мастацкая літаратура» можна набыць на Дні беларускага пісьменства ў Івацэвічах, ахвотныя знойдуць яго і ў кніжных крамах Беларусі.

**Людміла ІВАНОВА.**

---

— Не, гэта толькі аснова рамана. Дзеянне адбываецца ў Дзісненскім павеце, у Шаркаўшчыне, шмат рэтраспектыўных эпізодаў. Паказана ўся складаная эпоха, з 1905 года да 1919-га. Людзі тады гінулі з-за самых розных прычын. Айцец Канстанцін Жданаў прыняў смерць за веру ў Бога. Пабудаваная ім царква дасюль дзейнічае, яна ніколі не зачынялася. А Канстанцін Жданаў — у сонме праваслаўных святых, яго мошчы знаходзяцца ў кафедральным саборы Полацка.

***— А як знайшліся мошчы святога пакутніка?***

— Пасля расстрэлу вернікі таемна адкапалі цела бацюшкі і перапахавалі па ўсім праваслаўным чыне ў склепе пад алтаром Дзісненскай могілкавай Свята-Адзігітрыеўскай царквы. Амаль сто гадоў мошчы святога знаходзіліся там. У 2008 годзе нятленныя мошчы свяшчэннамучаніка Канстанціна дасталі, пераклалі ў новую труну і размясцілі ва Уваскрасенскім храме Дзісны. У 2009 годзе на Сінадальнай камісіі па кананізацыі святых Рускай праваслаўнай царквы было прынята рашэнне аб царкоўным услаўленні іерэя Канстанціна Жданава, і яго мошчы даставілі ў Полацкі Спаса-Ефрасіннеўскі манастыр, дзе адбыліся іх агляд і перааблачэнне. 27 красавіка 2020 года мошчы свяшчэннамучаніка перанеслі з Дзісны ў старажытны Полацк, у Богаяўленскі кафедральны сабор. Калі з'явіўся зборнік мастацкіх твораў, прысвечаных святому, мяне папрасілі напісаць прадмову. А на просьбы напісаць самому пра айца Канстанціна Жданава доўга адмаўляўся: як гэта я асмелюся пісаць пра святога? Наважыўся, напісаў апавяданне, потым узяўся за раман.

**«Там шмат дакументальнага. Я вывучаў пратаколы следства, якое вялося, калі да ўлады ў раёне прыйшлі сапраўдныя камуністы і пачалі расследаванне злачынстваў папярэднікаў. Усе прахіндзеі на чале з Маляўкам былі арыштаваны і адпраўлены ў Віцебскую турму. Як, прыкладам, не скарыстаць было такі вычытаны ў дакументах факт: прыязджае Маляўка ў вёску, вісіць на вяроўках мокрая сподняя жаночая бялізна... Ён здымае, кладзе сабе ў торбу — і пайшоў. Але раман — найперш мастацкі твор, хоць пабудаваны на гістарычных звестках. Асабліва дапамагла кніга, падрыхтаваная па благаславенні і пад кіраўніцтвам епіскапа Полацкага і Глыбоцкага Ігнація «Што Бог пашле, тое і буду трываць». Назва — гэта апошнія словы, якія сказаў Канстанцін Жданаў».**

***— Шаркаўшчане ведаюць пра гэты ваш раман?***

— Ведаюць. Ён папярэдне быў надрукаваны ў гэтым годзе ў шасці нумарах часопіса «Полымя». Часопіс ёсць у бібліятэках, і на сёння ўсе нумары з маім раманам на руках у чытачоў. Але землякі яшчэ чакаюць і кнігу. Раман пераклаў на рускую мову Пятро Жаўняровіч, будзе друкавацца ў часопісе «Нёман».

***— Эмацыянальна цяжкая была праца?***

— Не проста цяжкая... Я не ведаю, як я гэта ўсё змог напісаць. Але напісаў. У красавіку скончыў і больш пакуль ні за што не магу ўзяцца. Дадам, што ў гэтым рамане я знайшоў магчымасць адказаць на пытанні, якія мяне мучылі ўсё жыццё. І дапамог знайсці адказы айцец Канстанцін Жданаў.

**Гутарыла Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

---

# «ВЫБІРАЛІ НАЙЛЕПШАЕ З НАЙЛЕПШАГА»

## Алесь Бадак пра Нацыянальную літаратурную прэмію — 2024

**Адна з самых яскравых падзей Дня беларускага пісьменства — цырымонія ўзнагароджвання пераможцаў рэспубліканскага конкурсу «Нацыянальная літаратурная прэмія». Адбудзецца гэта ў Івацэвічах, сёлетняй сталіцы свята. Сёння ўвечары на галоўнай сцэне ўрачыста адкрыюць канверты і агучаць імёны пераможцаў, таму пакуль што інтрыга захоўваецца... Але старшыня журы, вядомы паэт, дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алесь Бадак згадзіўся распавесці чытачам «Звязды» пра некаторыя аспекты сёлетняга конкурсу:**

— У гэтым годзе на конкурс было пададзена сорак дзевяць твораў. Многа ці мала? Трэба мець на ўвазе, што гэта ўжо тыя творы, якія прайшлі папярэдні адбор, калі іх вылучалі выдавецтвы, бібліятэкі, іншыя ўстановы. Значыць, да таго як кніжкі паступілі ў журы, яны ўжо вытрымалі конкурс. Таму мы выбіралі найлепшае з найлепшага. Гэта складана, тым больш вельмі мала выпадковых, нікому не вядомых намінантаў, за выключэннем намінацыі «Дэбют». Думаю, калі чытачы ўспомняць, хто атрымліваў раней Нацыянальную літаратурную прэмію, пагодзяцца са мной, што гэта людзі вартыя, сапраўды вядомыя пісьменнікі.

***— Якія намінацыі сёлета самыя «багатыя»?***

— Больш за ўсё намінантаў было ў прозе, публіцыстыцы і дзіцячай літаратуры. Публіцыстыка сёння, як паказвае нават наш конкурс, вельмі запатрабаваная. Людзям цікавы жанр сваёй актуальнасцю, тым больш калі гэта слова пісьменніка. Паэзія крыху саступіла свае традыцыйна лідарскія пазіцыі, хоць мы ведаем, што кніжак паэтычных выходзіць шмат. Але чытач сёння жыве актыўным жыццём, яго цікавіць тое, што адбываецца сёння ў нас, у свеце. Натуральна, і дзіцячых кніжак выходзіць шмат. Колькі б ні гаварылі, што дзеці сёння мала чытаюць, але гэта ўсё ж такі не зусім так. І дзеці чытаюць, і бацькі ім чытаюць, і самыя вялікія тыражы традыцыйна ў дзіцячай літаратуры.

***— Заўсёды складанай была ў плане напаўнення намінацыя «Дэбют», здаралася, у ёй нават не вызначалі пераможцаў. Як адбылося сёлета?***

— Так, намінацыя самая складаная, бо аўтары невядомыя. Вельмі небяспечна памыліцца ў сваім выбары, таму што прасцей выбіраць, калі аўтары ўжо шмат гадоў працуюць у літаратуры. Акрамя таго, калі мы гаворым пра маладых дэбютантаў, іх творчасць вельмі разнастайная, у тым ліку жанрава, стылёва. І важна, каб табе не перашкодзіў твой уласны густ даваць ацэнку маладым. Нешта можа не падабацца — заглыбленне ў сябе, крыху адарванасць ад сучаснасці. Мы ж мімаволі параўноўваем дэбютантаў з самімі сабой маладымі, калі мы пачыналі і паэзія была ў цэнтры грамадскага жыцця. Тым не менш і сярод маладых сёння ёсць лідары, аўтары, вартыя ўвагі. Ва ўсялякім разе, сёлета было з чаго выбіраць, меліся прэтэндэнты, вартыя таго, каб атрымаць такую важную і прэстыжную прэмію.

***— Ці прадстаўлена была драматургія?***



— Прэтэндэнтаў хапала, праўда, выбіраць сярод кніжак драматургіі заўсёды нялёгка. Усё ж такі гэта жанр на мяжы літаратуры і тэатра, і вельмі важна, каб аўтары драматычных твораў, якія выходзяць асобным выданнем, былі вядомыя і ў тэатральных колах. Добрых драматургаў заўсёды мала. Таму не выпадае здзіўляцца, што мы не кожны год прысуджаем прэмію ў гэтай намінацыі.

***— Наколькі шырока былі прадстаўлены пісьменнікі рэгіёнаў?***

— Рэгіёны штогод прадстаўляюцца актыўна, бо маюць права вылучаць кандыдатаў і абласныя бібліятэкі, і абласныя арганізацыі СПБ... І ім важна, каб пераможцам стаў іх зямляк, чалавек, які часта ў іх выступае, якога добра ведаюць у вобласці, раёне. Калі паглядзець на пераможцаў мінулых гадоў, то вельмі часта імі становяцца аўтары, якія жывуць за межамі Мінска. Атрымліваць такую прэмію — вялікае свята, вялікае ўражанне. Калі да цябе прыцягнута ўвага не толькі калег, але і гледачоў каля сцэны, тэлегледачоў... Вельмі хвалююча. Напэўна, кожны, хто атрымліваў такую прэмію, запомніць гэта на ўсё жыццё.

***— А што выдавецтва «Мастацкая літаратура» сёлета прэзентуе на свяце?***

— Прадставім кнігу серыі «Беларусь літаратурная», якая выходзіць традыцыйна да кожнага Дня беларускага пісьменства. Кніга прысвечана літаратарам Івацэвічыны, а таксама 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На Дні беларускага пісьменства ў Івацэвічах ёсць стэнд з кнігамі лаўрэатаў Нацыянальнай літаратурнай прэміі, да якога наша выдавецтва мае самае непасрэднае дачыненне, — многія кнігі выходзілі менавіта ў нас. Там адбудуцца сустрэчы з аўтарамі кніг — пераможцамі конкурсу розных гадоў і аўтограф-сесіі. А імёны сёлетніх пераможцаў вы пачуеце ў найбліжэйшы час.

**«Больш за ўсё намінантаў было ў прозе, публіцыстыцы і дзіцячай літаратуры. Публіцыстыка сёння, як паказвае нават наш конкурс, вельмі запатрабаваная. Людзям цікавы жанр сваёй актуальнасцю, тым больш калі гэта слова пісьменніка. Паэзія крыху саступіла свае традыцыйна лідарскія пазіцыі, хоць мы ведаем, што кніжак паэтычных выходзіць шмат».**

**Людміла ІВАНОВА.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие
«Минский областной центр инвестиций и приватизации»
(организатор аукциона)
по поручению **ОАО «Криница»** (продавец)
проводит открытый аукцион

## по продаже здания детского сада

*(составные части и принадлежности: терраса)*
**с инв. № 642/С-34332, общей площадью 309,8 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 622885000701000185 (право аренды по 20.03.2036), площадью 0,3901 га по адресу: Минская область, Копыльский район, Тимковичский с/с, д. Великая Раёвка, ул. Школьная, 3А.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **25 700,29 бел. руб.**
Задаток 10 % от начальной цены – **2 570,00 бел. руб.**
*Начальная цена снижена на 80 %.*

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169 330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by

Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 31.10.2023, 08.12.2023, 05.03.2024.

Аукцион состоится **23.09.2024** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **20.09.2024** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11.**
**Тел. для осмотра: (8029) 863-50-96.**

УНП 100006988

ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ООО «Бизнес РМ», Могилевская обл., г. Кировск, ул. Кирова 70, УНП 193626295 |
| **Предмет электронных торгов:** **ЗДАНИЕ СПАСАТЕЛЬНОГО ПОСТА** (здание специализированное иного назначения), инв. номер 600/С-72502, общей площадью 158,9 кв. м, по адресу: Минская обл., Минский р-н, Папернянский с/с, д. Семков Городок | **Начальная цена (с НДС 20 %) – 864 000,00 бел. руб. (снижение 10 %)** |
| **Сведения о земельном участке с кадастровым номером 623685510101000099:** предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания здания спасательного поста в районе д. Семков Городок общей площадью 0,0600 га | |
| **Задаток 5 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB 30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638 | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов | |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи | |
| **Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **3 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов | |
| Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия | |
| Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 17.07.2024 г. | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: 24.09.2024 г. с 11.00 до 13.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов | |
| **Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **23.09.2024 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by | |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 373 21 33, +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

## ИЗВЕЩЕНИЕ О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

**Поплавский сельский исполнительный комитет**
извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Березинского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: **Минская область, Березинский район, д. Негоничи, ул. Приречная, д. 26** (полный адрес указан согласно похозяйственным книгам), имеющий основания для признания его пустующим.

**Сведения о жилом доме (из акта):**
Наружные размеры одноквартирного жилого дома: 5х8 м.
Площадь: 40,0 кв. м.
Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного жилого дома: 1936.
Материал стен: дерево.
Этажность: одноэтажный.

На придомовой территории не осуществляются предусмотренные законодательством мероприятия по охране земель.

Не соблюдаются требования к содержанию (эксплуатации) территории.

Сведениями о лицах, включая наследников, которым предположительно одноквартирный жилой дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им: **Трепенок Иван Иванович, умерший 12.01.2018 года.**

Предположительный срок непроживания в одноквартирном жилом доме собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом: более 10 лет.

От лиц, имеющих право пользования жилым домом, в Поплавский сельский исполнительный комитет не поступило уведомлений о намерении использовать такой дом для проживания.

Поплавский сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения уведомить Поплавский сельский исполнительный комитет о намерении использовать пустующий дом для проживания.

**Телефоны для справок:**
**801715-6-3-818, 801715-6-3821, 801715-6-3825.**

УНП 600036561

В производстве **суда Московского района г. Минска** находится гражданское дело по заявлению администрации Московского района г. Минска об объявлении умершим ТКАЧЕВА Николая Александровича, 30.07.1951 года рождения, зарегистрированного по адресу: город Минск, улица Алибегова, дом 23, квартира 44.

Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам, которые располагают сведениями о Ткачеве Николае Александровиче, сообщить об этом в суд Московского района г. Минска по адресу: г. Минск, проспект газеты «Правда», 27, кабинет № 230, в течение двух месяцев с момента публикации.

## О ПОИСКЕ ПРАВООБЛАДАТЕЛЕЙ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА

**д. Смолярня Березинского района Минской области**

Поплавский сельский исполнительный комитет в целях реализации Указа Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами» разыскивает собственников, наследников и лиц, имеющих право пользования жилым домом: **Минская область, Березинский район, д. Негоничи ул. Приречная, д. 26.**

Сельисполком просит граждан, располагающих информацией о собственниках, о месте их фактического проживания либо местонахождении, сообщить в Поплавский сельисполком по телефонам: **801715-63818, 801715-63821 (с 08.00 до 17.00 по рабочим дням), 8029-7002212 – в любое время.**

Также информацию можно прислать по адресу: **223334, аг. Поплавы, ул. Октябрьская, д. 2, Минская область. УНП 600537220.**

Электронный адрес: **poplavss@berezino.gov.by**

УНП 600036561

## ИЗВЕЩЕНИЕ О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

**Поплавский сельский исполнительный комитет**
извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Березинского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: **Минская область, Березинский район, д. Купы, ул. Центральная, д. 12** (полный адрес указан согласно похозяйственным книгам), имеющий основания для признания его пустующим.

**Сведения о жилом доме (из акта):**
Наружные размеры одноквартирного жилого дома: 6х9 м.
Площадь: 54,0 кв. м.
Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного жилого дома: 1956.
Материал стен: дерево.
Этажность: одноэтажный.

На придомовой территории не осуществляются предусмотренные законодательством мероприятия по охране земель.

Не соблюдаются требования к содержанию (эксплуатации) территории.

Сведения о лицах, включая наследников, которым предположительно одноквартирный жилой дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им: **Жавнерович Леонид Дмитриевич, умерший 20.05.2005 г.**

Предположительный срок непроживания в одноквартирном жилом доме собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом: более 19 лет.

От лиц, имеющих право пользования жилым домом, в Поплавский сельский исполнительный комитет не поступило уведомлений о намерении использовать такой дом для проживания.

Поплавский сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения уведомить Поплавский сельский исполнительный комитет о намерении использовать пустующий дом для проживания.

**Телефоны для справок:**
**801715-6-3-818, 801715-63-821, 801715-63-8-25.**

УНП 600036561

## ИЗВЕЩЕНИЕ О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

**Поплавский сельский исполнительный комитет**
извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Березинского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: **Минская область, Березинский район, д. Лучки, ул. Лесная, д. 13** (полный адрес указан согласно похозяйственным книгам), имеющий основания для признания его пустующим.

**Сведения о жилом доме (из акта):**
Наружные размеры одноквартирного жилого дома: 6х8 м.
Площадь: 48,0 кв. м.
Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного жилого дома: 1957.
Материал стен: дерево.
Этажность: одноэтажный.

На придомовой территории не осуществляются предусмотренные законодательством мероприятия по охране земель.

Не соблюдаются требования к содержанию (эксплуатации) территории.

Сведениями о лицах, включая наследников, которым предположительно одноквартирный жилой дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им: **Трепенок Александра Гавриловна, умершая 03.11.2001 года.**

Предположительный срок непроживания в одноквартирном жилом доме собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом: более 20 лет.

От лиц, имеющих право пользования жилым домом, в Поплавский сельский исполнительный комитет не поступило уведомлений о намерении использовать такой дом для проживания.

Поплавский сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения уведомить Поплавский сельский исполнительный комитет о намерении использовать пустующий дом для проживания.

**Телефоны для справок:**
**801715-6-3-818, 801715-6-3821, 801715-6-3825.**

УНП 600036561

## ИЗВЕЩЕНИЕ О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

**Поплавский сельский исполнительный комитет**
извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Березинского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: **Минская область, Березинский район, д. Смолярня, ул. Широкая, д. 10** (полный адрес указан согласно похозяйственным книгам), имеющий основания для признания его пустующим.

**Сведения о жилом доме (из акта):**
Наружные размеры одноквартирного жилого дома: 6х4,7 м.
Площадь: 28,0 кв. м.
Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного жилого дома: 1939.
Материал стен: дерево.
Этажность: одноэтажный.

На придомовой территории не осуществляются предусмотренные законодательством мероприятия по охране земель.

Не соблюдаются требования к содержанию (эксплуатации ) территории.

Сведениями о лицах, включая наследников, которым предположительно одноквартирный жилой дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им: **Романовский Фёдор Антонович, умерший 16.05.1989 года, Романовский Георгий Фёдорович, умерший 08.05.2020 года**

Предположительный срок непроживания в одноквартирном жилом доме собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом: более 20 лет.

От лиц, имеющих право пользования жилым домом, в Поплавский сельский исполнительный комитет не поступило уведомлений о намерении использовать такой дом для проживания.

Поплавский сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения уведомить Поплавский сельский исполнительный комитет о намерении использовать пустующий дом для проживания.

**Телефоны для справок:**
**801715-6-3-818, 801715-6-3821, 801715-6-3825.**

УНП 600036561

## О ПОИСКЕ ПРАВООБЛАДАТЕЛЕЙ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА

**д. Купы Березинского района Минской области**

Поплавский сельский исполнительный комитет в целях реализации Указа Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами» разыскивает собственников, наследников и лиц, имеющих право пользования жилым домом: **Минская область, Березинский район, д. Купы, ул. Центральная, д. 12.**

Сельисполком просит граждан, располагающих информацией о собственниках, о месте их фактического проживания либо местонахождении, сообщить в Поплавский сельисполком по телефонам: **801715-63818, 801715-63821 (с 08.00 до 17.00 по рабочим дням), 8029-7002212 – в любое время.**

Также информацию можно прислать по адресу: **223334, аг. Поплавы, ул. Октябрьская, д. 2, Минская область. УНП 600537220.**

Электронный адрес: **poplavss@berezino.gov.by**

УНП 600036561

## О ПОИСКЕ ПРАВООБЛАДАТЕЛЕЙ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА

**д. Мартияновка Березинского района Минской области**

Поплавский сельский исполнительный комитет в целях реализации Указа Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами» разыскивает собственников, наследников и лиц, имеющих право пользования жилым домом: **Минская область, Березинский район, д. Лучки, ул. Лесная, д. 13.**

Сельисполком просит граждан, располагающих информацией о собственниках, о месте их фактического проживания либо местонахождении, сообщить в Поплавский сельисполком по телефонам: **801715-63818,801715-63821 (с 08.00 до 17.00 по рабочим дням), 8029-7002212 – в любое время.**

Также информацию можно прислать по адресу: **223334, аг. Поплавы, ул. Октябрьская, д. 2, Минская область. УНП 600537220.**

Электронный адрес: **poplavss@berezino.gov.by**

УНП 600036561

## О ПОИСКЕ ПРАВООБЛАДАТЕЛЕЙ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА

**д. Смолярня Березинского района Минской области**

Поплавский сельский исполнительный комитет в целях реализации Указа Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами» разыскивает собственников, наследников и лиц, имеющих право пользования жилым домом: **Минская область, Березинский район, д. Смолярня, ул. Широкая, д. 10.**

Сельисполком просит граждан, располагающих информацией о собственниках, о месте их фактического проживания либо местонахождении, сообщить в Поплавский сельисполком по телефонам: **801715-63818, 801715-63821 (с 08.00 до 17.00 по рабочим дням), 8029-7002212 – в любое время.**

Также информацию можно прислать по адресу: **223334, аг. Поплавы, ул. Октябрьская, д. 2, Минская область. УНП 600537220**

Электронный адрес: **poplavss@berezino.gov.by**

УНП 600036561

# ЗНОЎ У ШКОЛУ, або «сіндром 1 верасня»



## Як пазбегнуць школьнага стрэсу

**Пачатак навучальнага года напрамую датычыцца не толькі дзяцей і падлеткаў школьнага ўзросту, але і іх бацькоў. І для бацькоў часам уступленне іх дзіцяці ў чарговы (а тым больш першы) школьны год — няхай гэта будзе першаклашка або цалкам ужо, здавалася б, дарослы дзявяцікласнік — абарочваецца сапраўдным стрэсам. Значна большым, чым для самога школьніка. У псіхолагаў ёсць нават такі тэрмін — «сіндром 1 верасня», прычым гаворку тут яны вядуць не пра дзяцей, а пра дарослых...**



Характарызуецца «сіндром» станам трывожнасці і стрэсу ў бацькоў (часцей у мам) дзяцей школьнага ўзросту, асабліва выяўлены ў мам першакласнікаў і вучняў выпускных класаў (9-га і 11-га). Трывожнасць нарастае пачынаючы з сярэдзіны жніўня (самы «гарачы» перыяд падрыхтоўкі да школы, калі закупляюцца школьныя прылады і «экіпіроўка»), дасягае піку ў апошнія летнія дні (калі ў школах праходзяць бацькоўскія сходы напярэдадні навучальнага года, а ў бацькоўскіх чатах абмяркоўваюць набыццё навучальных дапаможнікаў, платныя і бясплатныя гурткі і факультатывы і букеты класнаму кіраўніку на Дзень ведаў). Зрэшты, да канца верасня «сіндром» праходзіць сам сабой, а жыццё сям'і зноў уваходзіць у каляіну. І ўсё ж, каб зберагчы ўласныя нервы, варта «вынырнуць» са стрэсу як мага раней. А яшчэ лепш — наогул яго пазбегнуць. «А гэта магчыма?» — спытаеце вы. Магчыма, запэўнівае **сямейны псіхолаг, гештальт-тэрапеўт Кацярына ГАРЭЛЫШАВА.**

### «Адзнакі ў дзённіку дзіцяці — гэта не адзнакі вам «за бацькоўства»

— З прыходам 1 верасня новае жыццё пачынае ўся сям'я, — тлумачыць псіхолаг. — «Школьныя гады цудоўныя» спаўна пражываюць і бацькі школьніка. Калі дзяцей у сям'і некалькі — то некалькі разоў, ад першага званка да апошняга. Невыпадкова мамы і таты ў бацькоўскіх чатах 31 мая віншуюць адно аднаго з летнімі канікуламі, а 1 верасня — з Днём ведаў. Сям'я і школа — партнёры ў выхаванні дзіцяці. Але гэтыя зносіны апасродкаваныя, праз дзяцей, і часам паўплываць на тую ці іншую сітуацыю (якая датычыцца адзнак, узаемаадносін дзіцяці з настаўнікамі або аднакласнікамі) бацькі ў поўнай меры не могуць. Усведамленне гэтага факта спараджае трывожнасць і стрэс. Зразумела, даросламу чалавеку значна больш камфортна, калі вырашэнне той ці іншай важнай для яго сітуацыі залежыць у першую чаргу ад яго дзеянняў, а не ад дзеянняў іншага чалавека (у дадзеным выпадку — яго дзіцяці). Таму мая першая парада бацькам школьнікаў — дамовіцца з сабой і адмовіцца ад імкнення трымаць жыццё дзіцяці пад поўным і няўхільным кантролем. Асабліва гэта важна для бацькоў дзяцей, якія падраслі. Як маці ці бацька, вы, вядома, павінны імкнуцца дапамагаць дзіцяці і з вучобай, і з яго станаўленнем як асобы. Падтрымка і пачуццё абароненасці ў бацькоўскай сям'і — неад'емная частка фарміравання здаровай псіхікі чалавека. Але ўсё ж добрая вучоба, як і ўзаемаадносіны з аднагодкамі (калі, вядома, гаворка не ідзе аб крайнасцях — булінгу, фізічным уздзеянні, іншых небяспечных сітуацыях), — сфера адказнасці школьніка. А бацькам варта ўсвядоміць, што школа — звычайны для кожнага і непазбежны ў жыцці кожнага этап, праз які праходзяць усе, і «адмяніць» яго нельга. І нараўне з мінусамі ён мае нямала плюсаў. Успомніце свае школьныя гады — напэўна, станоўчых, добрых успамінаў у вас будзе больш, чым негатыўных.

***— Звычайная прычына перажыванняў бацькоў на працягу навучальнага года — адзнакі ў дзённіку іх дзяцей...***

— Бацькам важна разабрацца ў сабе і зразумець, чаму для іх настолькі важныя адзнакі дзіцяці. Вядома, добры атэстат шмат у чым вызначае магчымасці дзіцяці пры паступленні ў сярэднія і вышэйшыя навучальныя ўстановы. Але ж адзнакі ў дзённіку хвалююць бацькоў не толькі ў выпускных класах, калі яны сапраўды важныя, а пачынаючы з малодшага школьнага ўзросту. І вельмі часта — з прычыны таго, што бацькі ўспрымаюць іх як адзнакі... сабе. Гэта я «не змагла данесці веды, не дазаймалася з сынам/дачкой, не прымусіла вывучыць». Вы не паверыце, колькі бацькоў жывуць з думкай «я дрэнная маці» ці «я дрэнны бацька», хоць аб'ектыўна гэта зусім не так. Адзнакі вашага дзіцяці — гэта не адзнакі асабіста вам «за бацькоўства». Больш за тое, значна важнейшыя за адзнакі ўсё ж рэальныя веды, якія атрымлівае ў школе ваша дзіця. І, вядома, важна пастарацца, каб няўдача на ўроку і дрэнная адзнака не спалучаліся для дзіцяці дома яшчэ і з негатыўнымі эмоцыямі — вельмі часта гэта можа прывесці да адваротнага выніку: няўпэўненасці ў сабе, стрэсу, зніжэння цікавасці да вучобы. Значна больш дзейсным будзе матываваць дзіця пры дапамозе даверлівай, добразычлівай гутаркі. І яшчэ — увядзіце правіла не «чырвонай», а «зялёнай ручкі»: яго апісваюць многія педагогі. Сутнасць у тым, што чырвонай ручкай падкрэсліваюцца памылкі, а зялёнай — тыя задачы, якія школьнік вырашыў правільна, і тыя практыкаванні, дзе ён не памыліўся. Мы любім факусіравацца на памылках і гадзінамі лаяць за іх дзіця. А вось хваліць за правільна выкананае заданне ці добрую адзнаку неяк забываем. Мімаходзь скажам: «Ну, добра, маладзец», і ўсё. Між тым факусіравацца больш прадукцыйна на поспехах у вучобе, а няўдачы і памылкі — прапрацоўваць, але не рабіць падставай для доўгага і нуднага адчытвання дзіцяці.

**Характарызуецца «сіндром» станам трывожнасці і стрэсу ў бацькоў (часцей у мам) дзяцей школьнага ўзросту, асабліва выяўлены ў мам першакласнікаў і вучняў выпускных класаў (9-га і 11-га). Трывожнасць нарастае пачынаючы з сярэдзіны жніўня (самы «гарачы» перыяд падрыхтоўкі да школы, калі закупляюцца школьныя прылады і «экіпіроўка»), дасягае піку ў апошнія летнія дні (калі ў школах праходзяць бацькоўскія сходы напярэдадні навучальнага года, а ў бацькоўскіх чатах абмяркоўваюць набыццё навучальных дапаможнікаў, платныя і бясплатныя гурткі і факультатывы і букеты класнаму кіраўніку на Дзень ведаў). Зрэшты, да канца верасня «сіндром» праходзіць сам сабой, а жыццё сям'і зноў уваходзіць у каляіну. І ўсё ж, каб зберагчы ўласныя нервы, варта «вынырнуць» са стрэсу як мага раней. А яшчэ лепш — наогул яго пазбегнуць.**

Асабліва варта, напэўна, звярнуцца да мам і тат тых школьнікаў, якіх у канцы навучальнага года чакаюць экзамены і паступленне ў сярэднія і вышэйшыя навучальныя ўстановы. Не палохайце сябе загадзя, што нешта «можа не атрымацца», не ўзвальвайце на сябе «празмерны груз адказнасці» і не трансліруйце ўсё гэта вашаму падлетку. Калі адчуваеце трывогу і вам здаецца, што не можаце сядзець склаўшы рукі, лепш распрацаваць разам з дзіцем прыкладны план работы на навучальны год і спакойна яго прытрымлівацца. Менавіта спакойны рух у вызначаным кірунку — залог поспеху. А трывога спараджае толькі стрэсы. Але тут важна выканаць дзве ўмовы. Па-першае, не кідайцеся складаць і рэалізоўваць такі план ужо ў першыя дні верасня, дайце школьніку «ўцягнуцца ў вучобу». І, па-другое (і гэта галоўнае), паспрабуйце ўлічыць яго пажаданні і інтарэсы. Не варта вырашаць за яго, куды ён будзе паступаць, спрабуючы рэалізаваць уласныя няўвасобленыя мары, жаданні і амбіцыі. Бо гаворка ідзе пра яго, а не пра ваша жыццё.

### «Не хвалюйцеся самі і не хвалюйце вашага школьніка»

***— Якія яшчэ псіхалагічныя і арганізацыйныя памылкі звычайныя для бацькоў школьнікаў?***

— Іх нямала. Гэта і ўстаноўка ў сям'і, калі поспехі ў вучобе пазіцыяніруюцца як галоўная ўмова любові і прыняцця. І фарміраванне стаўлення да школы як да пакарання («Не будзеш рабіць урокі — заўтра пойдзеш у школу!» — кажа бацька сыну, які знаходзіцца дома з ВРВІ). І завышаныя чаканні ў адносінах да поспехаў у вучобе і адзнак: нерэальныя мэты непазбежна выклічуць у школьніка пачуццё бездапаможнасці. Гэта і параўнанне дзіцяці з іншымі — не на яго карысць, зразумела (той самы праслаўуты «сын маміной сяброўкі», у якога ўсё атрымліваецца). І спроба вырасціць генія, калі школьніка акрамя вучобы запісваюць у дзясятак секцый, студый і гурткоў, часта не ўлічваючы яго інтарэсы. Празмерны ўдзел бацькоў у школьным жыцці, як і поўная адсутнасць цікавасці да школы — абедзве крайнасці таксама не пажаданыя. Але самай галоўнай памылкай на дадзены момант я назвала б трансліраванне дзіцяці свайго хвалявання ў сувязі з набліжэннем старту новага навучальнага года. Старайцеся не хвалявацца самі, не хвалюйце вашага школьніка, і першыя два тыдні вучобы пройдуць спакойна і пазітыўна — і для яго, і для вас.

***— А як бацькам дапамагчы дзіцяці адаптавацца да першых дзён новага навучальнага года пасля самых доўгіх за год канікулаў?***

— Перш за ўсё — адкарэкціраваць рэжым дня. Выбудоўваць яго трэба было, вядома, яшчэ ў жніўні, але калі вы пра гэта не паклапаціліся, пачніце хаця б цяпер. Калі школьнік спіць менш за 9 гадзін, ён адчувае недахоп адпачынку, схільны да стрэсаў і часцей хварэе. Важна таксама правільна пабудаваць рэжым прыёму ежы. Вытрымлівайце гэты рэжым дня і ў будні, і ў выхадныя. Апроч станоўчага ўплыву на псіхалагічны стан дзіцяці і яго здароўе, гэта дысцыплінуе, а дысцыпліна — аснова эфектыўнага навучання. Не ўлівайцеся ў шалёны рытм непасрэдна з 1 верасня. Не трэба пачынаць адразу і вучобу, і гурткі-секцыі. Уваходзьце ў гэты рытм паступова. Да сярэдзіны або канца верасня дзіця адаптуецца да школьных нагрузак, а вы зможаце ацаніць, колькі часу ў яго застаецца на дадатковую адукацыю з улікам работы над дамашнім заданнем. Яшчэ адна парада: калі ў вас малодшы школьнік, то адводзіць у школу яго лепш тату, а сустракаць — маме. Тата настроіць на плённую працу і не дасць разнюніцца, а мама — забяспечыць цёплы сямейны мікраклімат, пакажа дзіцяці, што бацькі яго чакаюць і заўсёды яму рады. Гэты прынцып, дарэчы, працуе і для дзіцячага садка. І, нарэшце, паспрабуйце зрабіць вячэрнюю даверлівую размову сямейнай традыцыяй. Не «разбор палётаў», а менавіта размову па душах. Калі з малодшага школьнага ўзросту ваша дзіця прывыкне дзяліцца з вамі падзеямі, якія адбыліся за дзень, і сваімі эмоцыямі ў сувязі з гэтымі падзеямі, у падлеткавым узросце, хутчэй за ўсё, гэтую звычку захавае і не замкнецца ў сабе. А значыць, падлеткавы крызіс сына ці дачкі пройдзе для вас як для бацькоў значна лягчэй.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

# Алена СВЯТЛІЧНАЯ: «Ад алімпійскай мары мы адмаўляцца не збіраемся»



## Што стаіць за прыгожай карцінкай сінхроннага плавання

Зачаравальны, хвалюючы, казачны — ніводзін іншы від спорту не атрымлівае больш узнёслых эпітэтаў, чым сінхроннае плаванне. Але за гэтай прыгажосцю — шматгадзінныя трэніроўкі, праца ў зале, бясконцае паўтарэнне аднаго і таго ж руху... І ўсё гэта ў выкананні маладых дзяўчат. Беларускае сінхроннае плаванне, у прынцыпе, трымаецца на жаночых плячах. Алена Святлічная — не толькі галоўны трэнер нацыянальнай зборнай, але і старшыня Беларускай федэрацыі сінхроннага плавання. Дзве трэніроўкі ў дзень і пастаяннае вырашэнне арганізацыйных пытанняў, сярод якіх мноства праблемных, — гэта яе штодзённы графік. У казачным сінхронным плаванні сябе не шкадуе ніхто. І аддача ад такіх намаганняў ёсць. У пачатку года Васіліна Хандошка заваявала бронзавы медаль чэмпіянату свету ў катэгорыі «сола». Пакуль Васіліна — адзіная беларуская спартсменка, якая можа выступаць на міжнародных стартах. Міжнародная федэрацыя плавання дапусціла толькі індывідуальных спартсменаў, два і больш — гэта ўжо каманда. Калі б не гэтае правіла, беларускія сінхраністкі маглі б змагацца за права выступіць на Алімпійскіх гульнях, але ў іх гэту магчымасць забралі. Зрэшты, дзяўчаты не разгубіліся — на сваім галоўным старце сезона, Гульнях БРІКС, заваявалі сем медалёў. Такія вынікі, паводле слоў Алены Святлічнай, радуюць і падбадзёрваюць. Што стаіць за гэтымі ўзнагародамі, яна распавяла «Звяздзе».

***— Алена Віктараўна, сутнасць сінхроннага плавання нават непрафесіяналу будзе зразумелая з назвы: два і больш чалавекі сінхронна выконваюць праграму. У многіх можа ўзнікнуць пытанне: «Пры чым тут катэгорыя «сола», у якой выступае адна спартсменка?»***

— Не варта забываць, што з 2017 года сінхроннае плаванне перайменавалі ў артыстычнае, таму зацыклівацца на тым, што два чалавекі павінны нешта рабіць сінхронна, ужо некарэктна. Раней «сола» было алімпійскай дысцыплінай, сёння ўжо не. Усё лагічна і проста: спартсменка змагаецца за медаль, яна не залежыць ні ад каманды, ні ад партнёраў. Яна можа разлічваць толькі на сябе і сама адказвае за свае памылкі. І таму, як правіла, у сола выступаюць наймацнейшыя спартсменкі ў краіне.

***— Сёння ў Беларусі Васіліне Хандошка хтосьці можа скласці канкурэнцыю ў сола?***

— Пакуль не. У вышэйшым звяне мы робім акцэнт на дуэты і групы. Я не выключаю, што сярод падрастаючых зорачак ёсць змена Васіліне, якая ў будучыні блісне, таму што моцныя спартсменкі ў нас ёсць. Сола і псіхалагічна складаная дысцыпліна. Трэба адарвацца ад каманды, даказаць, што ты наймацнейшая, ні на кога і ні на што не звяртаць увагі і проста працаваць. Вельмі многа працаваць. Прычым як самой спартсменцы, так і яе трэнеру.

***— А патэнцыяльныя групы на будучыню сярод падрастаючага пакалення праглядаюцца?***

— Гэта не так працуе. Дзеці растуць, набіраюцца досведу, праходзяць адбор — група набіраецца натуральным чынам. Многія са спорту сыходзяць пасля заканчэння школы, але хтосьці застаецца. Прафесійныя групы пачынаюць фарміравацца гадоў у 13-14. Менавіта ў гэтым узросце трэба максімальна навучыць дзяцей працаваць. Калі не навучыць — выніку не будзе. І той, хто гэта вытрымае, не зламаецца і пойдзе далей, у будучыні зможа паказваць вынікі. У вышэйшым звяне патрэбны спартсмены, якія ўмеюць і прывыклі працаваць. Бо на гэтым узроўні яны працуюць за грошы дзяржавы. А тут падыход просты: ці выкарыстоўвай іх з розумам і давай вынік, ці не займай чужое месца.

***— Васіліна Хандошка за два дні да выступлення на чэмпіянаце свету памяняла праграму, што было звязана з новай сістэмай ацэньвання. На ваш погляд, да чаго прывядзе новая сістэма правіл?***

— Сёння ў нас у правілах чырвонай лініяй праходзіць складанасць. А харэаграфія і артыстызм адышлі на другі план. Можна паставіць залімітавую складанасць, выканаць праграму на сярэднім узроўні і атрымаць высокія балы. Бываюць форс-мажоры, калі спартсменка паказвае і добрую складанасць, і харэаграфію, і артыстызм, але ў звязцы дапусціла памылку, што паніжае адзнаку за цэлы элемент, і спартсменка з 1 месца апускаецца на 12-е. Стварылі ў правілах праклаз, з-за якога памылка адной каманды можа прывесці на п'едэстал іншую каманду. У прынцыпе, гэта нядрэнна. Раней суддзі ацэньвалі краіну, а з новымі правіламі ацэньваецца непасрэдна выступленне спартсменаў. Раней на пытанне «Што трэба зрабіць, каб падняцца вышэй?» нам адказвалі: «Дадайце складанасці». Мы яе дадавалі, але вышэй не падніmaліся, таму што паставіць на пастамент спартсменку з Беларусі і Расіі нельга, трэба ж і Францыі, Кітаю, ЗША і іншым па медалі даць. Васіліна ў юніёрскім узросце ўвесь час была чацвёртай, хоць усе ёй казалі: «Ты была першая, але мы цябе паставілі на чацвёртае». А каму ад гэтага лягчэй? Адзнакі за складанасць былі вельмі суб'ектыўныя. Новыя правілы гэта выправілі. Спартсменкі і трэнеры разумеюць, што ім трэба зрабіць, каб атрымаць высокую адзнаку за складанасць. Але праблема ў тым, што не засталося месца для харэаграфіі, знікла мастацкая частка. Дзяўчаты ў вадзе круцяць вінты, робяць кручэнні, каб набраць складанасці. Цалкам згубілася відовішчнасць сінхроннага плавання. Асабліва гэта заўважна ў групах. Раней спартсменкі рабілі звязкі або асінхронныя рухі, каб была незвычайная карцінка, цікавая гледачу. А цяпер усе робяць аднолькавыя элементы, але ў рознай паслядоўнасці, каб проста атрымаць адзнакі за складанасць. А як гэта ацэньваць? Хто больш дадасць у праграму звязак, паваротаў і кручэнняў — той і перамог. Гэта значыць, трэба знаходзіць баланс паміж складанасцю і прыгожай карцінкай. Здаецца, адышлі ад адной праблемы — узнікла іншая, але ўсё роўна засталіся ў тупіку.

***— Калі з'явіліся медалі з чэмпіянатаў Еўропы, чэмпіянату свету, цікавасць да сінхроннага плавання ў краіне вырасла?***

— Шалёнага ажыятажу няма. На жаль, колькасць дзяцей, якія займаюцца, нават паменшылася. Ды і школ, якія набіраюць дзяцей, у нас няшмат: дзве — у Мінску і па адной — у Гомелі і Брэсце. Вялікі адсеў адбываецца ў 13—15 гадоў. Калі ў гэтым узросце дзеці не трапляюць у юнацкую зборную, яны не бачаць мэты, каб далей працаваць. Да вялікага спорту даходзяць адзінкі. Па ідэі, ва ўсіх розны перыяд сталення: адзін раскрываецца ў 13 гадоў, другі можа раскрыцца ў 15. Але ж патрэбны трэнеры, якія змогуць утрымаць, падтрымаць і дапамагчы раскрыцца, няхай і пазней за аднагодак. А ў нас вялізная праблема з трэнерскім складам. У нас на ўсю краіну 32 трэнеры. З іх два ў Гомелі, шэсць — у Брэсце і астатнія — у Мінску. З-за недахопу кадраў мы не можам дазволіць сабе займацца дзецьмі, якія не патрапілі ў юнацкую каманду, і раскрываць іх здольнасці далей. Яны могуць рэалізаваць сябе ў спорце, але з-за таго, што няма трэнераў, дарога ў спорт для іх, па сутнасці, закрываецца. На жаль, энтузіястаў, гатовых працаваць ад званка да званка ў басейне, працаваць з ненармаваным графікам, вельмі мала. А ў сінхронным плаванні патрэбны яшчэ спецыялісты па харэаграфіі і акрабатыцы. З намі 30 гадоў працаваў харэограф Валянцін Аляксандравіч Астрэйка, але ён пайшоў на пенсію. І пакуль мы не можам знайсці харэографа, які жыў бы нашым спортам. Харэаграфію ставім самастойна, звяртаемся па дапамогу да знаёмых. Акрамя гэтага, важная і акрабатычная частка. Дзяўчатам трэба круціцца і круціцца ў вадзе, без стабільнай апоры, а гэта вельмі складана. У нас ёсць спецыяліст па акрабатыцы, але ён працуе са спартсменамі зборных каманд не на пастаяннай аснове. Забяспечыць яго поўным працоўным днём мы не можам — у нас не хапае груп і нагрузкі для дастойнай аплаты працы.



Нацыянальная зборная па сінхронным плаванні.

***— Ці ёсць у сінхроннага плавання перспектывы ў рэгіёнах?***

— Вельмі хацелася б развіваць спорт у рэгіёнах. Але як гэта рабіць без трэнераў? Сінхроннае плаванне — не мастацкая гімнастыка, у нас можна хоць да 40 гадоў выступаць. Але для гэтага павінны быць кваліфікаваныя трэнеры, камфортная база, цёплы басейн.

***— Нягледзячы на ўсе арганізацыйныя складанасці, спорт развіваецца, пацвярджэнне таму — медалі нашых спартсменак. За кошт чаго гэта магчыма?***

— У 2019 годзе ў нас сфарміравалася каманда, якая не баіцца цяжкасцяў. Тады з'явіліся і першыя медалі на чэмпіянаце Еўропы, нашы дзяўчынкі нядрэнна выступілі на чэмпіянаце свету, потым Васіліна стала прызёрам. Метадам спроб і памылак каманда і працуе. Дзякуючы гэтым людзям мы і прыбаўляем.

***— Што нашы спартсменкі страцілі за два гады адхілення ад міжнародных стартаў?***

— Мы страцілі досвед. На Гульнях БРІКС мы ўпершыню ўбачылі каманду Карэі, каманду моцную. Я заўважыла, што ў нашых дзяўчат прапаў дух сапернiцтва, яны глядзяць на канкурэнтаў і пачынаюць іх баяцца. Мы цяпер знаходзімся ў вельмі камфортных, «цяплічных» умовах, а драмы спаборніцтваў, моманту нечаканасці няма. Без гэтага, насамрэч, складана. Дзяўчаты выконваюць свае праграмы на належным узроўні, але яны могуць рабіць іх лепш, калі адчуюць дух барацьбы. А як яго адчуць, калі міжнароднай спаборніцкай практыкі няма? На спаборніцтвы ў Расію мы прыязджаем, у першую чаргу, як сябры, а не сапернікі. У мінулым годзе ў дзяўчынак быў адзін міжнародны старт — клубны турнір у Дубаі. Гэта быў выдатны досвед, але што такое адзін турнір. Аднак нават у гэтай сітуацыі можна знайсці плюсы. Калі б мы выступалі на міжнародных спаборніцтвах, мы б не ведалі, чаго чакаць ад новых правілаў. А пакуль увесь свет да іх прывыкае, мы назіраем, робім высновы і вучымся на чужых памылках. Выступаем у ролі назіральніка пакуль. Затое калі вернемся на міжнародную арэну, мы ўжо гатовы да ўсяго.

***— Алена Віктараўна, вы сумяшчаеце пасаду галоўнага трэнера зборнай і пасаду старшыні федэрацыі. Адказнасць каласальная. Як сіл на ўсё хапае?***

— Мой працоўны дзень пачынаецца ў 7 раніцы і заканчваецца пасля сямі вечара. З 7 да 12 раніцы — першая трэніроўка, з 15 да 19 — другая, там я галоўны трэнер. У перапынках паміж трэніроўкамі можна папрацаваць старшынёй федэрацыі. Тэмп шалёны, але інакш ніяк, бо акрамя нас ніхто гэтую работу не зробіць. У нацкамандзе працуе 10 спартсменаў і чатыры спецыялісты: галоўны трэнер, начальнік каманды, урач і масажыст. Нагрузка ва ўсіх каласальная. Сіл не заўсёды хапае. Рукі апускаюцца ледзь не кожны тыдзень — гэта непазбежна. Але спартсмены гэтага не бачаць, такія моманты іх непасрэднай спартыўнай падрыхтоўкі не датычацца. І, як бы ні было цяжка выцягваць масу складаных момантаў, мы павінны знаходзіць сілы заставацца для іх галоўнай апорай. З паперамі я працаваць не люблю, але люблю працаваць са спартсменамі. У сваіх спартсменах я бачу вынік сваіх намаганняў, укладзеных сіл, сваіх ідэй — непадробнае задавальненне, дзеля якога варта працаваць 24 на 7. Гэта і трымае.

***— Чатыры гады таму вы казалі, што галоўная мэта — адабрацца на Алімпійскія гульні. На Алімпіядзе ў Токіа вашы падапечныя выступілі, прычым годна. Якая цяпер вялікая мэта?***

— У першую чаргу, вярнуцца на міжнародную арэну, каб спартсменкі зноў адчулі драйв і жаданне спаборнічаць, прадстаўляць сцяг Рэспублікі Беларусь. Вядома, стаіць мэта адабрацца на Алімпійскія гульні 2028 года, ад алімпійскай мары мы адмаўляцца не збіраемся. Спадзяёмся, што ўсе негатыўныя моманты, уласцівыя сучаснаму міжнароднаму спорту, скончацца, разумны сэнс пераможа. Мы павінны быць гатовы да гэтага і быць у форме! Матывацыя ў дзяўчат ёсць. Але яна стане яшчэ вышэйшай, калі будзе больш спаборніцтваў. У гэтым можна нават не сумнявацца.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# Абвастраецца канфлікт паміж Крамянёвай далінай і Еўрасаюзам

**Канфлікт паміж амерыканскімі IT-гігантамі і Еўрасаюзам абвастраецца, паведаміла Bloomberg. Кампаніі з Крамянёвай даліны адмаўляюць еўрапейскім карыстальнікам у запуску перадавых функцый з-за палітыкі ЕС па жорсткім рэгуляванні развіцця тэхналогій штучнага інтэлекту (ШІ) і лічбавых рынкаў увогуле.**



Так, Apple адмовілася выпускаць у краінах ЕС праграмнае забеспячэнне на базе сваёй ШІ-платформы Apple Intelligence, якое стане даступна амерыканскім карыстальнікам на iPhone, iPad і Mac у гэтым годзе. Такое ж рашэнне прыняла Meta па сваім чат-боце на базе ШІ-мадэлі Llama. Прычынай у абодвух выпадках паслужылі жорсткае тэхналагічнае рэгуляванне, якое дзейнічае ў ЕС, антыманапольны кантроль і заканадаўства ў сферы абароны персанальных даных.

Рашэнне кампаній не выпускаць у ЕС свае ключавыя прадукты з'яўляецца «эскалацыяй даўняга канфлікту паміж Крамянёвай далінай і Еўрапейскім саюзам», піша Bloomberg. Адзначаецца, што блок даўно «зарэкамендаваў сябе як сусветны лідар у галіне жорсткага тэхнічнага рэгулявання і антыманапольнага кантролю».

Кампаніі, якія сутыкнуліся з рэгуляваннем ЕС, падкрэсліваюць «непрадказальны характар еўрапейскага нарматыўнага асяроддзя» і сцвярджаюць, што такая палітыка пагражае спыніць развіццё ШІ-тэхналогій. Пазіцыя ж Еўрасаюза заключаецца ў тым, што змякчэнне рэгуляцыі «пагоршыць урон, які ўжо наносіць глабальнае дамінаванне Крамянёвай даліны ў тэхналагічнай сферы».

Як вядома, у сакавіку Еўракамісія пачала расследаванне супраць Apple, Meta і Alphabet з-за парушэнняў з іх боку закона аб лічбавых рынках (Digital Markets Act, DMA), які ўступіў у дзеянне летась у маі. Кампаніям пагражаюць абаротныя штрафы да 10 працэнтаў іх сусветнай выручкі. Акрамя таго, сёлета ў маі Савет ЕС зацвердзіў закон аб штучным інтэлекце, які ўводзіць жорсткія патрабаванні да ШІ-прадуктаў і іх распрацоўшчыкаў. За іх парушэнні таксама прадугледжаны значныя абаротныя штрафы.

# У Швейцарыі навучыліся рабіць шакалад па-новаму

**Вытворцы шакаладу традыцыйна абыходзіліся з какавай менавіта так: выкарыстоўвалі зерне і пазбаўляліся ад іншых частак. Але цяпер навукоўцы ў Швейцарыі, якія займаюцца пытаннямі харчавання, прыдумалі новы спосаб вырабу шакаладу, пры якім у ход ідзе ўвесь плод, а не толькі бабы — і пры гэтым не выкарыстоўваецца цукар.**

Шакалад, які распрацаваны ў аўтарытэтным Федэральным тэхналагічным інстытуце Цюрыха групай навукоўцаў пад кіраўніцтвам Кіма Мішры, уключае ў сябе мякаць пладоў какавы, сок і эндакарпій (пласт вакол насення), паведаміла «Бі-бі-сі». Гэты працэс ужо прыцягнуў увагу кампаній, якія займаюцца вытворчасцю экалагічна ўстойлівых прадуктаў харчавання.

Яны тлумачаць, што пры традыцыйнай вытворчасці шакаладу з выкарыстаннем толькі зерняў астатнія часткі пладоў — пamерам з невялікі гарбуз і поўныя пажыўных рэчываў — застаюцца гніць на палях. Сакрэт вырабу новага віду шакаладу — у вельмі салодкім соку плода какавы. Па словах распрацоўшчыка Кіма Мішры, у яго яркі фруктовы смак, які крыху нагадвае ананас.

Гэты сок, які змяшчае 14 працэнтаў цукру, праходзіць працэс перагонкі да ўтварэння высокаканцэнтраванага сіропу. Пасля гэты сіроп змешваюць з мякаццю і дадаюць туды высушаны эндакарпій. Такім чынам працэс робяць максімальна экалагічным, гэта значыць, ніякая частка плода не губляецца. У выніку ўтвараецца вельмі салодкае і густое какава-жэле. Пры злучэнні з бабамі для вытворчасці шакаладу гэта жэле выконвае ролю цукру, гэта значыць, выкарыстоўваць дадатковыя падсалоджвальнікі больш не трэба.

«Каб паспяхова развіваць вытворчасць тых ці іншых прадуктаў, неабходна наватарства, — кажа Мішра. — Інакш атрымаецца звычайны шакалад сярэдняга ўзроўню». Партнёрам Мішры ў яго праекце выступіла кампанія КОА, швейцарскі стартап, які займаецца экалагічна ўстойлівым вырошчваннем какавы. Яе сузаснавальнік Аніян Шрайбер лічыць, што выкарыстанне ўсяго какава-плода дапаможа вырашыць многія праблемы гэтай індустрыі: ад росту цэн на какава-бабы да павальнай беднасці фермераў.

«Замест таго, каб высвятляць, каму дастанецца якая частка торта, можна зрабіць сам торт большы — і ад гэтага выйграюць усе, — тлумачыць Шрайбер. — Фермеры атрымаюць значны дадатковы даход за кошт продажу ўсёй какава-масы, але, акрамя таго, спатрэбіцца дадатковая прамысловая перапрацоўка ў краінах, якія вырабляюць гэту прадукцыю. У выніку дзяржавы-вытворцы змогуць выйграць ад з'яўлення працоўных месцаў і дадатковага даходу».

Але пакуль кошт новага шакаладу ў цяперашніх умовах будзе больш высокі. Тым не менш вытворцы ў краінах, дзе вырошчваецца какава — ад Гаваяў да Гватэмалы і Ганы, — ужо



звязаліся з Мішрай для атрымання інфармацыі аб новым метадзе. У Швейцарыі некаторыя буйныя вытворцы, у тым ліку Lindt, пачынаюць выкарыстоўваць какава-бабы цалкам, але ніводны з іх да гэтага часу не зрабіў крок да поўнай адмовы ад цукру.

«Мы павінны знайсці смелых вытворцаў шакаладу, якія жадаюць пратэсціраваць рынак і зрабіць свой унёсак у стварэнне больш экалагічнага шакаладу, — кажа Мішра. — Тады мы зможам разбурыць сістэму». Магчыма, такіх смелых вытворцаў можна знайсці ў Швейцарыі, чыя шакаладная прамысловасць штогод вырабляе 200 тысяч тон шакаладу на суму каля двух мільярдаў долараў.

Роджэр Верлі з асацыяцыі вытворцаў Chocosuisse таксама лічыць, што ў шакаладнай прамысловасці ёсць па-экалагічнаму ўстойлівая і пры гэтым больш пазітыўная перспектыва. «Я думаю, што шакалад і ў будучыні займее фантастычны смак, — упэўнены ён. — І попыт на яго будзе толькі расці з-за павелічэння колькасці насельніцтва планеты».

# Берлінскія рэстараны губляюць кліентаў

**У Берліне адзін за адным знікаюць рэстараны вытанчанай кухні. Толькі за апошні год у нямецкай сталіцы закрыліся пяць самых вядомых гастранамічных устаноў. Іншыя пераглядаюць сваю канцэпцыю, каб прывабіць кліентаў і быць на плаву.**

Па меркаванні шэф-кухара Себасцьяна Франка, які працуе ў рэстаране Horvath, адзначаным дзвюма зоркамі Мішлен, сітуацыя сур'ёзная, перадае Euronews. «У 2010 годзе, калі я тут пачынаў, было ўсяго сем рэстаранаў, адзначаных зоркамі Мішлен, а праз 10 гадоў іх было 20. Тады людзі былі гатовы траціць свае грошы. Цяпер усё значна змянілася, — перакананы эксперт. — Рынак зноў сціскаецца».

У мінулым годзе, паводле нядаўна праведзенага даследавання, у Германіі зачыніўся практычна кожны дзясяты рэстаран. На падыходзе — нямала банкрутстваў, папярэджваюць эксперты, паколькі бізнес, не паспеўшы акрыяць ад пандэміі, пацярпеў ад рэзкай інфляцыі. Нямецкая асацыяцыя гасцінічнага і рэстараннага бізнесу DEHOGA яшчэ ў студзені забіла трывогу наконт таго, што рэстаранам давядзецца закрыцца. Урад пасля пандэміі зноў павысіў ПДВ для рэстаранаў з 7 да 19 працэнтаў. Падобна, неспрыяльныя прагнозы ўжо спраўджваюцца.



Як адзначае Герыт Бухарн з DEHOGA, «у апошнія гады з-за COVID, войн і г. д. аперацыйныя выдаткі значна павялічыліся, што асабліва адчуваюць рэстараны і інвестары. Гэта, у сваю чаргу, уплывае на цэны». Шэф-кухар рэстарана Horvath лічыць, што COVID быў толькі пачаткам: «Я думаю, што ў перспектыве нас чакае нешта значна большае, калі ўзнікнуць значна больш сур'ёзныя праблемы, чым пытанне аб тым, ці зможам мы заўтра пайсці ў рэстаран».

Для многіх берлінскіх рэстаранаў мінулы год прынёс мала прыбытку. Пэўна, і 2024-ы пакіне такі ж горкі асадак.

# Глабальнаму агратэху не хапае інвестыцый

**Па выніках мінулага года памер сукупнага фінансавання ў аграхарчовыя тэхналагічныя стартапы аказаўся на самым нізкім узроўні за апошнія шэсць гадоў. Нявызначаныя перспектывы развіцця ўсёй сусветнай эканомікі, неапраўдана высокія працэнтныя стаўкі, крах амерыканскага тэхналагічнага фінансавага інстытута Silicon Valley Bank, а таксама скарачэнне рынку першаснага публічнага размяшчэння акцый (IPO) уваходзяць у лік ключавых фактараў, якія прывялі да рэзкай «эрозіі» агратэхналагічных інвестыцыйных чаканняў, адзначыў expert.ru.**



Увогуле, на працягу апошняга дзесяцігоддзя інвестыцыі актыўна накіроўваліся ў сусветны сегмент агратэхналогій. 2021 год стаў рэкордным: галіна прыцягнула 53 мільярды долараў у профільныя прадпрыемствы, было інвеставана прыкладна ў 20 разоў больш венчурнага капіталу, чым у 2012-м. У той час венчурныя інвестыцыі ўзраслі толькі ў 11 разоў.

Але летась рынак агратэху ў свеце дэманстраваў адмоўную інвестыцыйную дынаміку. Памер сукупнага глабальнага фінансавання ў профільныя стартапы апусціўся ніжэй за сярэднія значэнні ў 2018—2021 гадах і склаў мінімальны за шэсць гадоў аб'ём — 15,6 мільярда долараў. Таксама скарацілася доля агратэхналагічных інвестыцый у агульным аб'ёме глабальнага ўсегаліновага венчурнага капіталу. У мінулым годзе на агtxарчовыя тэхналогіі прыпадала 5,5 працэнта ўсіх сродкаў венчурнага сектара ў параўнанні з 6,7 працэнта ў 2022-м і 7,6 працэнта ў 2021-м.

Як адзначаюць эксперты, сельская гаспадарка мае вялікую патрэбу ў інвестыцыях, таму што сектару вельмі важныя новыя тэхналогіі. На жаль, інвестыцыі ва ўсім свеце сапраўды зніжаюцца, і гэта звязана з падзеннем даходнасці ў АПК. Тым не менш інвестыцыйны клімат пакрысе ўсё ж паляпшаецца. Да таго ж харчовая бяспека для любой краіны стаіць на першым месцы, а без сучасных тэхналогій практычна немагчыма яе стварыць.

Згодна з прагнозам FAO, чаканы 30-працэнтны рост насельніцтва планеты да 2050 года запатрабуе апераджальнага павелічэння вытворчасці прадуктаў харчавання. Напрыклад, вытворчасць збожжа павінна ўзрасці на 50 працэнтаў. Істотная частка росту будзе абумоўлена павышэннем эфектыўнасці земляробства, пашырэння арашальнага вырошчвання. Павышэнне эфектыўнасці — гэта вывядзенне новых гібрыдаў і сартоў, развіццё дакладнага земляробства, развіццё розных іншых тэхналогій як у раслінаводстве, так і ў жывёлагадоўлі. Напрыклад, ураджайнасць пшаніцы па свеце за апошнія 50 гадоў узрасла ў 2,5 раза, і супастаўны рост неабходны, каб забяспечваць патрэбы насельніцтва ў будучыні. Гэтыя задачы якраз падыходзяць для агратэху і інавацыйных кампаній.

**Падрыхтаваў Захар БУРАК.**

# ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «На своей стороне с Приорбанком»

В настоящих Правилах Рекламной игры «На своей стороне с Приорбанком» (далее по тексту – Правила) используются следующие термины и определения:

**Банк** – «Приорбанк» открытое акционерное общество.

**База данных Банка** – программный комплекс Банка, обеспечивающий проведение банковских операций и содержащий информацию о Клиенте, достаточную для идентификации и аутентификации в соответствии с Общими условиями.

**Карточка** – личная дебетовая банковская платежная карточка «Приорбанк» ОАО Платежных систем, которую на основании Договора карточки и (или) Договора вклада Банк выдает Клиенту, и (или) кредитная банковская платежная карточка «Приорбанк» ОАО Платежных систем, которую на основании Кредитного договора Банк выдает Клиенту.

**Счет** – текущий (расчетный) банковский счет, либо текущий (расчетный) банковский счет, доступ к которому обеспечен Клиенту с использованием банковской платежной карточки или ее реквизитов, либо счет по учету вклада (депозита), либо счет по учету кредитной задолженности Клиента по кредиту, предоставленному Банком на основании Кредитного договора с использованием банковской платежной карточки.

**Мобильное приложение Prior Online** — сервис Интернет-Банка для мобильных устройств на базе ОС Android, iOS, HarmonyOS.

